STRENGTHENING
CIVIL SOCIETY
GLOBALLY



# 2018 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

## БЕЛАРУСЬ

ВЕРАСЕНЬ 2019

USAID FROM THE AMERICAN PEOPLE

ICNL INTERNATIONAL CENTER FOR NOT-FOR-PROFIT LAW

fhi360 THE SCIENCE OF IMPROVING LIVES

# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - 2018

## КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ, БЕЛАРУСЬ

## ВЕРАСЕНЬ, 2019

**Складальнікі:**

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці
Бюро па справах дэмакратыі, канфліктах і гуманітарнай дапамозе
Цэнтр перадавога вопыту ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і кіравання

**У партнёрстве з:**

FHI 360
Міжнародным цэнтрам некамерцыйнага права (ICNL)

Гэтае выданне стала магчымым дзякуючы падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці ў межах Пагаднення аб супрацоўніцтве № AID-OAA-LA-17-00003

Фота на вокладцы: варкшоп па развіцці крытычнага мыслення "Пункт гледжання", які праводзіўся з мэтай пашырэння правоў і магчымасцей косаўскай моладзі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел каля пяцідзесяці маладых мужчын і жанчын як з гарадскіх, так і з сельскіх раёнаў Косава.

Крыніца: USAID Косава

*Дысклэймер: усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, з'яўляюцца асабістым пунктам гледжання экспертаў, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы справаздачы, і не абавязкова адлюстроўваюць кропку гледжання USAID або FHI 360.*

# УВОДЗІНЫ

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID) прадстаўляе дваццаць другое выданне Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (CSOSI) краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, якое апісвае тэндэнцыі і змены ў развіцці секатара АГС у 2018 годзе.

У гэтым годзе Індэкс змяшчае справаздачы па стане сектара АГС у 24 краінах рэгіёну, ад Прыбалтыкі на поўначы да Каўказа на поўдні і ад краін Вышаградскай групы на захадзе да Расіі, якая цягнецца на ўсход да Ціхага акіяна. Індэкс аналізуе як поспехі, так і няўдачы ў фармаванні ўстойлівасці АГС па сямі ключавых кампанентах або параметрах: прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктура сектара і грамадскі імідж. Індэкс прызначаны стаць карыснай крыніцай інфармацыі для мясцовых АГС, дзяржаўных органаў, донараў, акадэмічнай супольнасці і іншых зацікаўленых бакоў, якія хочуць лепш разумець і кантраляваць ключавыя аспекты ўстойлівасці сектара.

Метадалогія Індэкса абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ў кожнай краіне ствараюць экспертную групу для ацэнкі і ранжыравання параметраў устойлівасці АГС за год. Экспертная група ўзгадняе балы па кожным параметры ад 1 (устойлівасць высокая) да 7 (устойлівасць нізкая). Затым падлічваецца сярэдняя велічыня па ўсіх выстаўленых балах і атрымліваецца агульны бал устойлівасці АГС у кожнай краіне. Рэдакцыйная калегія, якая базуецца ў ЗША і складаецца з тэхнічных і рэгіянальных экспертаў, рэцэнзуе балы кожнай экспертнай групы і адпаведныя апісальныя справаздачы з мэтай захавання аднастайнасці падыходаў і стандартаў для параўнання сітуацыі ў розных краінах.

Дзеля таго, каб забяспечыць узгодненасць шкалы ацэнак у розных краінах, вымярэнні некалькіх параметраў у Індэксе гэтага года былі рэкалібраваныя, каб лепш адлюстраваць рэальную сітуацыю ў супрацьлегласць параўнанню паказчыкаў з папярэднім годам. Гэтыя балы адзначаны ў асобных справаздачах. Больш падрабязна пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання справаздач, а таксама для рэкаліброўкі балаў, можна знайсці ў поўнай версіі Індэкса на англійскай мове на сайтах USAID і FHI360.

Індэкс устойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі дапаўняе аналагічныя публікацыі па іншых рэгіёнах: Індэкс устойлівасці АГС краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары ацэньвае сектар грамадзянскай супольнасці ў 31 краіне; Індэкс устойлівасці АГС краін Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі ахоплівае 7 краін; Індэкс устойлівасці АГС краін Азіі ўключае справаздачы па 9 краінам. Акрамя таго, у гэтым годзе публікуецца першая справаздача па Мексіцы. Такім чынам, усе выданні Індэкса ўстойлівасці АГС у 2018 годзе змяшчаюць інфармацыю агулам па 72 краінах.

Для далейшага вывучэння гістарычных дадзеных і папярэдніх справаздач Індэкса ўстойлівасці АГС, калі ласка, наведайце сайт www.csosi.org.

# АГЛЯД СІТУАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ

Індэкс устойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі 2018 года дае інфармацыю пра дасягненні і няўдачы грамадскіх арганізацый і ініцыятыў па сямі ключавых параметрах, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектараў АГС у 24 краінах.

Краіны, якія ахоплены гэтым выданнем Індэкса, працягваюць моцна адрознівацца па агульнаму ўзроўню ўстойлівасці АГС. Эстонія дагэтуль мае самы высокі ўзровень устойлівасці сектара не толькі ў Індэксе ўстойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, але і ў Індэксах па ўсім свеце. Грамадскія арганізацыі ў Эстоніі, як і ў большасці іншых краін Балтыі і Вышаградскай групы, працуюць у спрыяльным прававым асяроддзі, валодаюць моцным арганізацыйным патэнцыялам і з'яўляюцца актыўнымі абаронцамі правоў і пастаўшчыкамі паслугаў. Нягледзячы на тое, што фінансавая ўстойлівасць працягвае заставацца адным з самых слабых параметраў, АГС у гэтых краінах маюць доступ да больш разнастайных крыніц фінансавання, у тым ліку да дзяржаўных грантаў і кантрактаў, індывідуальнай і карпаратыўнай дабрачыннасці.

З іншага боку спектра – Беларусь і Азербайджан. Хаця устойлівасць АГС у абедзвюх краінах у 2018 годзе крыху палепшылася, АГС працягваюць працаваць у прававых умовах, якія абмяжоўваюць доступ да фінансавання, асабліва замежнага, практычна не маючы магчымасцяў для незалежнага адвакатавання. АГС у гэтых краінах валодаюць адносна слабым арганізацыйным патэнцыялам і нізкай падтрымкай грамадскасці.

Разрыў паміж гэтымі канцамі спектра скарачаецца. У той час як устойлівасць АГС у такіх краінах, як Польшча і Славакія, якія знаходзяцца на самым высокім узроўні, у 2018 годзе пагоршылася, устойлівасць у Азербайджане і Беларусі павысілася.

## ІСТОТНЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗМЕНЫ

Як заўсёды, палітычныя змены ўнутры краіны маюць значны ўплыў на АГС. У 2018 годзе Арменія перажыла самую драматычную палітычную трансфармацыю ў рэгіёне, якая атрымала назву Аксамітнай рэвалюцыі. Пасля заканчэння свайго канчатковага прэзідэнцкага тэрміну Серж Саргсян быў прызначаны прэм'ер-міністрам, і пасля ўвядзення папраўкі ў Канстытуцыю 2015 года гэтая пасада стала больш магутнай, чым пасада прэзідэнта. Па краіне прайшлі масавыя акцыі пратэсту супраць відавочнага захопу ўлады, якія ўключалі дэцэнтралізаваныя забастоўкі і блакаду буйных аўтамабільных дарог. У адказ на гэта 23 красавіка Саргсян заявіў аб адстаўцы. Лідэр апазіцыі Нікол Пашынян быў абраны прэм'ер-міністрам і сфармаваў новы ўрад. У снежні адбыліся датэрміновыя парламенцкія выбары, на якіх апазіцыйныя партыі атрымалі рашучую перамогу над старым рэжымам і над Рэспубліканскай партыяй Арменіі (РПА), якая трымала ўладу амаль дваццаць гадоў. Грамадзянская супольнасць адыграла істотную ролю падчас гэтых падзей праз мабілізацыю значнай колькасці выбарчых акругаў у падтрымку акцый пратэсту і прасоўванне антыкарупцыйнай павесткі і правоў чалавека, а таксама падрыхтоўку да назірання за працэсам выбараў пасля адстаўкі Саргсяна.

Масавыя пратэсты ў Славакіі таксама прывялі да палітычных зменаў на працягу года. Пасля таго, як у лютым у сваёй кватэры былі забітыя рэпарцёр і яго нявеста, па ўсёй краіне прайшлі масавыя дэманстрацыі з патрабаваннем дбайнага незалежнага расследавання забойстваў, якія нібыта былі звязаныя з самастойным журналісцкім расследаваннем сувязей паміж славацкімі бізнесменамі, палітыкамі і мафіяй. У выніку палітычнага крызісу адбыліся перастаноўкі на міністэрскіх пасадах і адстаўка прэм'ер-міністра. Аднак кіруючая кааліцыя краіны не змянілася, і аналітыкі лічаць, што ў якасці старшыні асноўнай партыі экс-прэм'ер будзе працягваць кіраваць Сдавакіяй з-за кулісаў. Роля АГС у арганізацыі дэманстрацый была адлюстраваная ў паляпшэнні іх бала за адвакатаванне, але таксама стала прычынай таго, што супраць іх была накіравана паклёпніцкая кампанія, што прывяло да пагаршэння грамадскага іміджу сектара, а таксама агульнай устойлівасці.

У 2018 годзе адметныя выбары прайшлі ў Босніі і Герцагавіне, Грузіі і Латвіі. У лістападзе Грузія абрала першую жанчыну-прэзідэнта; паводле супярэчлівых паправак у Канстытуцыю, прынятых у 2017 годзе, яна таксама

стане апошнім прэзідэнтам Грузіі, абраным шляхам прамых выбараў. Парламенцкія выбары адбыліся ў Латвіі ў кастрычніку; вынікі выбараў, у якіх новаўтвораныя партыі атрымалі значную колькасць дэпутацкіх мандатаў, дазваляюць выказаць здагадку, што грамадзяне стаміліся ад «старой палітыкі», у якой абраныя чыноўнікі не слухаюць электарат. Нягледзячы на тое, што агульныя выбары ў Босніі і Герцагавіне прайшлі ў кастрычніку, працяглая спрэчка аб выбарчым заканадаўстве не дазволіла краіне легальна сфармаваць урад. Няма яснасці, калі будзе знойдзена выйсце з гэтага палітычнагна становішча.

У іншых краінах выбары прайшлі з менш драматычнымі вынікамі: прэзідэнцкія выбары ў Чэхіі, усеагульныя выбары ў Венгрыі, мясцовыя і прэзідэнцкія выбары ў Чарнагорыі, мясцовыя выбары ў Польшчы і Славакіі, мясцовыя і парламенцкія выбары ў Славеніі. АГС у гэтых краінах адукоўвалі выбаршчыкаў, прасоўвалі сваіх кандыдатаў і праводзілі назіранне за выбарамі. Акрамя таго, грамадскія актывісты балатаваліся і перамагалі на выбарах у многіх краінах. У Расіі і Азербайджане падчас прэзідэнцкіх выбараў іх кіраўнікі засталіся на сваіх пазіцыях, але гэтыя выбары не адпавядалі дэмакратычным нормам.

## ПАЛЯРЫЗАЦЫЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Хаця Індэкс вымярае ўстойлівасць сектараў АГС у цэлым, грамадзянская супольнасць ніколі не бывае маналітнай. У многіх краінах, якія ахоплены гэтым выданнем, сектар АГС моцна палярызаваны і часта адлюстроўвае глыбокія падзелы ў грамадстве. Гэтая палярызацыя праяўляецца па-рознаму. Часцей за ўсё АГС маюць супярэчлівыя пазіцыі, у тым ліку і па вельмі прынцыповых пытаннях. У больш экстрэмальных выпадках органы ўлады мэтанакіравана дзеляць сектар, выбарачна прымяняючы законы, абмяжоўваючы доступ некаторых арганізацый да дзяржаўнага фінансавання, дазваляючы толькі нясталы доступ да працэсаў прыняцця рашэнняў і ачарняючы АГС, з якімі яны не згодныя. Усе гэтыя тэндэнцыі адлюстраваныя ў гэтым выданні Індэкса ўстойлівасці АГС.

Сітуацыя, мабыць, найбольш ярка выяўленая ў Расіі, дзе па сутнасці існуе дзве грамадзянскія супольнасці: адна складаецца з мноства дабрачынных, спартыўных, моладзевых, культурніцкіх, адукацыйных арганізацый, якія

Выкарыстанне негатыўнай рыторыкі і сродкаў масавай інфармацыі для ачарнення АГС, якія крытычна ставяцца да ўрада, адыграла ключавую ролю ў паўсюдным памяншэнні ўзроўню грамадскага іміджу ў 2018 годзе (дзесяць краінаў сутыкнуліся з такім спадам). Аб'ём і маштаб паклёпніцкіх кампаній у розных краінах розныя. У Славакіі, у той час як традыцыйныя СМІ станоўча асвятлялі ролю АГС у масавых акцыях пратэсту ў пачатку года, негатыўнае асвятленне і дэзінфармацыя сталі больш распаўсюджанымі сярод альтэрнатыўных сродкаў масавай інфармацыі (асабліва ў інтэрнэт-выданнях), і часта сустракаліся гісторыі пра «Фонды Сораса» і «праплачаных агентаў з-за мяжы», асабліва накіраваныя на АГС, якія займаюцца адвакатаваннем. У выніку каардынатары нефармальнай ініцыятывы «Годная Славакія» (Decent Slovakia), якая арганізоўвала масавыя акцыі пратэсту, былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці за спробу дзяржаўнага перавароту, хаця з-за адсутнасці доказаў абвінавачванні былі знятыя. У Грузіі ўрад і кіруючая партыя адрэагавалі на ўзмацненне крытыкі з боку АГС скаардынаванай прапагандысцкай кампаніяй, прычым асноўны сюжэт быў засяроджаны на меркаваных палітычных прадузятасцях і антынацыянальных матывах дзейнасці АГС. У Латвіі сітуацыя не такая складаная, але грамадскаму іміджу АГС пастаянна пагражае негатыўная рыторыка з боку палітыкаў і некаторых дзяржаўных служачых высокага ўзроўню. Напрыклад, АГС Transparency International Latvia Delna была прызнана некампетэнтнай для маніторынгу праекта па абнаўленні трамвайнай лініі ў Рызе. Справаздачы па Малдове, Румыніі, Сербіі і Чэхіі таксама паведамляюць пра рост нападаў на грамадзянскую супольнасць. Нават у Эстоніі, якая мае найбольшую ацэнку грамадскага іміджу ў рэгіёне, быў выпадак, калі сябры правай кансерватыўнай партыі ў парламенце публічна атакавалі АГС, якія прадстаўляюць меншасці, за іх фінансавую залежнасць ад дзяржаўных інстытутаў.

## УСКЛАДНЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ АГС НЕЗРАЗУМЕЛЫМІ ПРАВАВЫМІ НОРМАМІ

У 2018 годзе на АГС паўплывалі змены ў заканадаўствах на нацыянальных ўзроўнях, уведзеныя ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, якія тычацца такіх пытанняў, як адмыванне грошай, барацьба з тэрарызмам і канфідэнцыяльнасць дадзеных.

У адказ на дырэктыву Еўрапейскага Звяза (ЕЗ) аб адмыванні грошай у 2018 годзе шэраг краін, у тым ліку Балгарыя, Латвія, Румынія і Эстонія, распрацавалі ці прынялі законы, якія патрабуюць ад АГС называць сваіх «бенефіцыярных уладальнікаў», то бок бенефіціяраў, і выконваць іншыя патрабаванні, такія як арганізацыя навучання для сваіх супрацоўнікаў і кантроль за іх дзейнасцю. У дадатак да новых адміністрацыйных нагрузак на АГС гэтыя патрабаванні выклікалі блытаніну сярод АГС адносна таго, каго яны павінны прызначаць у якасці сваіх бенефіціяраў. Напрыклад, у Эстоніі, згодна з інструкцыямі, АГС павінны пазначаць свайго выканаўчага дырэктара як свайго бенефіцыяра, а не людзей, якія карыстаюцца паслугамі АГС. У Румыніі законапраект, накіраваны на рэалізацыю гэтай дырэктывы, ужываў тэрмін «бенефіцыярны ўладальнік» да кожнай фізычнай асобы, якой дапамагаюць АГС. У Латвіі АГС маюць магчымасць пазначаць у сваіх рэгістрацыйных дакументах, што немагчыма вызначыць бенефіцыяраў; аднак арганізацыі, якія так зрабілі, сутыкнуліся з цяжкасцямі ў працэсе рэгістрацыі.

Краіны, якія імкнуцца да сяброўства ў ЕЗ, прынялі аналагічныя законы. У Сербіі дзяржава абавязала ўсе існуючыя АГС рэгістраваць сваіх «рэальных уладальнікаў», пераследуючы больш шырокую мэту вызначыць пасля доўгіх гадоў прыватызацыі ўладальнікаў усіх юрыдычных асобаў у краіне. Інструкцыі былі недакладна зразумелымі, што прывяло да розных практык сярод АГС: некаторыя арганізацыі зарэгістравалі сваіх дырэктараў, сябраў праўлення і сябраў-заснавальнікаў, а іншыя ўвялі для гэтага ў сваіх структурах кіравання новыя пасады. Са жніўня 2018 года АГС Малдовы павінны былі прадставіць звесткі аб сваіх індывідуальных бенефіцыярах разам з іх імёнамі ў рамках больш шырокіх намаганняў дзяржавы па прадухіленні і барацьбе з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму. Арганізацыям, асабліва тым, што працуюць на карысць шырокай грамадскасці, напрыклад аналітычным цэнтрам, было цяжка вызначыць сваіх бенефіцыяраў. Таму некаторыя АГС паказалі свайго прэзідэнта ці выканаўчага дырэктара ў якасці атрымальніка дапамогі. Аднак гэта выклікала ў АГС заклапочанасць тым, што такая інфармацыя можа ўзмацніць недавер да сектара і меркаванне, што АГС працуюць у сваіх інтарэсах, а не на карысць грамадства. На АГС Паўночнай Македоніі таксама стаў распаўсюджвацца новы закон, які абавязвае іх аб'яўляць і захоўваць дадзеныя пра сваіх «сапраўдных уладальнікаў», які прадугледжвае пакаранне штрафам да 10 000 еўра за невыкананне патрабаванняў. Закон дагэтуль не дзейнічае, але

АГС асцерагаюцца, што калі банк не зможа вызначыць іх сапраўдных уладальнікаў, ён можа адмовіць арганізацыі як кліенту.

АГС таксама закранулі іншыя законы, накіраваныя на вырашэнне праблем з адмываннем грошай. Напрыклад у Косава, у адпаведнасці з рэгламентам Цэнтрабанка па барацьбе з адмываннем грошай АГС прасілі прадаставіць інфармацыю і заявы, якія пацвярджаюць, што яны не фінансуюць тэрарызм і не адмываюць грошы. Заявы павінны былі падпісаць заснавальнікі АГС, якіх ужо або няма ў краіне, або няма сярод жывых. У Сербіі Закон аб прадухіленні адмывання грошай, прыняты ў 2017 годзе, уступіў у моц у 2018 годзе. План дзеянняў па рэалізацыі гэтага закона ўключае ўзмацненне праверак АГС, аднак не існуе дакладнай інфармацыі пра тое, у якой ступені арганізацыі правяраліся ў 2018 годзе.

Падобным чынам АГС у краінах ЕЗ сутыкнуліся з праблемай неабходнасці выканання агульнага Рэгламента ЕЗ, які рэгулюе абарону дадзеных і іх прыватнасць (GDPR) і ўступіў у моц у траўні 2018 года. У Індэксах такіх краін, як Польшча, Славакія і Эстонія, адзначаецца, што АГС палічылі новыя патрабаванні незразумелымі, і таму яны намагаліся распрацаваць уласныя метады абароны дадзеных. Справаздачы па Балгарыі і Славеніі сведчаць, што рэалізацыя GDPR усклала значныя адміністрацыйныя нагрузкі на АГС, а ў Венгрыі АГС адчайна шукалі юрыдычную дапамогу за некалькі тыдняў да ўступлення GDPR у моц.

## НЕКАТОРАЕ ПАВЕЛІЧЭННЕ ФІНАНСАВАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ

Нягледзячы на тое, што фінансавая ўстойлівасць працягвае заставацца самым слабым параметрам, практычна ў кожнай краіне, якую ахоплівае гэтае выданне Індэкса, у 2018 годзе адбыліся некаторыя пазітыўныя зрухі, і палова (дванаццаць) краін паведамілі пра паляпшэнне сітуацыі . Гэтыя поспехі адбыліся, большай часткай, у краінах Паўднёвай групы і Еўразіі: пяць з дзевяці краін Паўднёвай групы палепшылі фінансавую ўстойлівасць, у той час як у Еўразіі пра гэта паведамілі ўсе краіны, за выключэннем Грузіі. Славенія была адзінай краінай Паўночнай групы, якая сведчыла пра станоўчы зрух у фінансавай устойлівасці. Гэтыя паляпшэнні былі абумоўлены пазітыўнымі зменамі ў дзяржаўным і замежным фінансаванні АГС, індывідуальнай дабрачыннасці, падаткаабкладанні і сацыяльным прадпрымальніцтве.

### *Дзяржаўнае фінансаванне*

Дзяржаўнае фінансаванне, незалежна ад таго, ці яно прадастаўляецца мясцовымі, рэгіянальнымі ці нацыянальнымі ўрадамі, ужо даўно з'яўляецца ключавой крыніцай фінансавання АГС у краінах ЕЗ. Рост дзяржаўнага фінансавання, а таксама ўдасканаленне размеркавання такога фінансавання адыгралі ключавую ролю ў агульным росце фінансавай устойлівасці ў 2018 годзе. Напрыклад, ва Украіне Міністэрства сацыяльнай палітыкі, Міністэрства моладзі і спорту і Міністэрства культуры разам выдзелілі на фінансаванне АГС суму памерам 1,6 млн. даляраў, што ў 1,7 разы больш у параўнанні з 2017 і 2016 гг. У Славеніі дзяржаўнае фінансаванне АГС у 2018 годзе вырасла на 9,5%, у той час як у Арменіі агульная сума бюджэта для некамэрцыйных грантаў і субсідыяў для АГС павялічылася прыблізна на 60%. У Чарнагорыі ў 2018 годзе пачалі ўкараняць новы механізм дзяржаўнага фінансавання АГС. Згодна з гэтым механізмам, урад вызначае прыярытэтныя напрамкі фінансавання на аснове прапаноў міністэрстваў, а потым профільныя міністэрствы выдзяляюць і размяркоўваюць сродкі. Новы механізм патрабуе, каб мінімум 0,3% бягучага рэспубліканскага бюджэта выдзялялася на фінансаванне праектаў і праграм АГС у сферах, якія прадстаўляюць грамадскі інтарэс, і 0,1% - у сферы абароны людзей з інваліднасцю. Акрамя таго, прынамсі 0,1% бюджэта павінна быць накіравана на суфінансаванне праектаў і праграм, якія фінансуюцца ЕЗ. У Косава і Азербайджане новыя дзяржаўныя органы ўвялі грантавыя схемы для АГС. Дзяржаўнае фінансаванне застаецца самай значнай крыніцай фінансавання АГС і ў Расіі.

Азербайджан, Арменія, Косава, Сербія і Славенія адзначаюць павышэнне празрыстасці дзяржаўнага фінансавання АГС. Сербскі ўрад зацвердзіў новую статутную норму аб празрыстасці фінансавання АГС і ў супрацоўніцтве з Праграмай развіцця ААН (ПРААН) стварыў электронны каляндар, у якім органы мясцовага самакіравання абавязаны публікаваць абвесткі конкурсаў на атрыманне фінансавых сродках з бюджэта, прызначаных для АГС. Працэс атрымання дзяржаўнага фінансавання АГС у Косава стаў больш празрыстым, паколькі, як высветлілася, у дзяржаўных установах шырока прымяняецца нарматыўны акт 2017 года, які патрабуе ўвядзення грамадскіх канкурэнтных працэсаў, знешніх сябраў камісіяў па ацэнцы, празрыстых крытэрыяў ацэнкі, а таксама мер па маніторынгу і кантролю. У Арменіі працэс размеркавання дзяржаўных грантаў стаў больш адкрытым і празрыстым пасля Аксамітнай

рэвалюцыі. У Азербайджане Савет падтрымкі НДА – асноўная крыніца фінансавання дзеючых АГС – увёў шэраг электронных навінак у працэдуру падачы заявак і адміністравання грошай, у тым ліку электронны графік падпісання кантрактаў, электронную праектную справаздачнасць і электронныя сродкі камунікацыі паміж камандай праекта і супрацоўнікамі Савета падтрымкі НДА. Працэдуры выдзялення і размеркавання дзяржаўных сродкаў у Славеніі таксама ўдасканаліліся. На нацыянальным узроўні, напрыклад, перадаплата стала стандартнай, у той час як на мясцовым узроўні некаторыя муніцыпалітэты спрасцілі свае правілы, а іншыя ўнеслі змены ў свае конкурсы заявак, якія ўдакладняюць крытэрыі прымальнасці і адбору, уводзяць шматгадовую падтрымку, прымаюць добраахвотную працу ў якасці натуральнага ўкладу і спрашчаюць формы заявак і патрабаванні да справаздачнасці.

Нягледзячы на гэтыя паляпшэнні, у шэрагу краін па-ранейшаму ўзнікаюць праблемы недастатковай празрыстасці працэсу дзяржаўнага фінансавання. У справаздачы па Паўночнай Македоніі адзначаецца, што ў большасці дзяржаўных установ, якія выдзяляюць гранты, адсутнічаюць выразныя крытэрыі, правілы і працэдуры, асабліва ў дачыненні да справаздачнасці і забеспячэнні празрыстасці выдзеленых сродкаў і кантролю над імі. У справаздачах па Босніі, Грузіі, Расіі, Сербіі і Украіне таксама адзначаюцца пастаянныя недахопы ў празрыстасці размеркавання дзяржаўнага фінансавання АГС.

Прадузятасць урада ў дачыненні да размеркавання дзяржаўных сродкаў па-ранейшаму застаецца праблемай, асабліва ў краінах, дзе аўтарытарныя ўрады накіроўваюць рэсурсы лаяльным арганізацыям. У Расіі велізарная колькасць дзяржаўнай падтрымкі ідзе шырокаму колу зарэгістраваных АГС, у тым ліку і арганізацыям, якія займаюцца пытаннямі экалогіі і правоў чалавека. Аднак найбольш актыўныя і прыкметныя праваабарончыя арганізацыі і АГС, зарэгістраваныя як замежныя агенты, рэдка атрымліваюць дзяржаўную падтрымку. Некаторыя АГС, зарэгістраваныя як замежныя агенты, аддаюць перавагу таму, каб нават не звяртацца за ўрадавай падтрымкай, бо баяцца, што гэта прывядзе іх да дадатковай праверкі. Большая частка дзяржаўнай падтрымкі АГС у Беларусі працягвае праходзіць у выглядзе прамога фінансавання лаяльных арганізацый, падкантрольных ураду. Як апісана вышэй, падобныя сітуацыі здараюцца і ў Венгрыі, і ў Польшчы, дзе «лаяльныя» арганізацыі атрымліваюць дастатковую колькасць дзяржаўнага фінансавання, у

той час як тыя АГС, якія займаюцца такімі пытаннямі, як дэмакратыя і правы чалавека, маюць абмежаваны доступ да гэтых крыніц фінансавання. У справаздачы па Грузіі адзначаецца, што многія АГС баяцца патэнцыяльнай палітызацыі ў выпадку атрымання дзяржаўнага фінансавання, а таксама магчымасці выкарыстання ўрадам фінансавання ў якасці рычага ўплыву.

### *Замежнае фінансаванне*

Замежнае фінансаванне працягвае заставацца асноўнай крыніцай падтрымкі АГС у многіх краінах Паўднёвай групы і Еўразіі, і станоўчыя зрухі, звязаныя з такім фінансаваннем, спрыялі паляпшэнню фінансавай устойлівасці АГС ў некалькіх краінах. Сербія і Украіна паведамілі, што ўзровень замежнага фінансавання ў 2018 годзе павялічыўся. У Албаніі, Косава і Сербіі адзначаеццца ўзмоцненае выкарыстанне донарамі схем субсідый, пры якіх альбо буйныя мясцовыя АГС, альбо замежныя АГС атрымліваюць фінансаванне ад донараў, а затым выдзяляюць субгранты меншым мясцовым АГС, што павялічвае колькасць арганізацый, якія могуць атрымаць доступ да такіх фондаў. Грамадскія арганізацыі ў Азербайджане, Беларусі і Расіі па-ранейшаму маюць вельмі абмежаваны доступ да замежнага фінансавання. Аднак у Азербайджане адбылося нязначнае павелічэнне колькасці замежных грантаў, ахвяраванняў і кантрактаў на паслугі, зарэгістраваных урадам у 2018 годзе.

### *Індывідуальная дабрачыннасць*

Індывідуальная дабрачыннасць па-ранейшаму займае досыць абмежаваную долю ў агульным фінансаванні АГС, але шэраг паспяховых намаганняў па зборы сродкаў апісаныя ў гэтым Індэксе. Напрыклад, у Расіі Фонд «Патрэбна дапамога» (Нужна помощь) распачаў кампанію #одинрубльвдень. Кампанія заклікала людзей здзейсняць невялікія штомесячныя ахвяраванні (у сярэднім – рубель у дзень), якія будуць аўтаматычна пералічаны ў адзін з 13 зацверджаных дабрачынных фондаў. Кампанія хутка стала папулярнай: за апошнія тры тыдні года 42 000 чалавек зрабілі ахвяраванні больш за 140 000 разоў, а іх агульная штомесячная сума на канец снежня перавысіла 7 мільёнаў рублёў ($ 111 000). У Латвіі Фонд мясцовай супольнасці у Валміеры стварыў спецыяльную картку пад назвай «РАЗАМ» (KOPĀ). Уладальнікі карткі атрымліваюць зніжкі ў мясцовых крамах, а ўладальнікі крамаў ахвяруюць частку грашовых паступленняў ад кліентаў у Фонд мясцовай супольнасці на падтрымку яго мерапрыемстваў. Дабрачынны рух «Шчодры аўторак» (Giving Tuesday) зараз

дзейнічае ў некалькіх краінах рэгіёну, у тым ліку ў Чэхіі і Расіі. У Чэхіі ў 2018 годзе было сабрана больш за 31 млн кронаў (1,3 млн даляраў), што прыблізна ў чатыры разы больш за 2017 год.

Таксама АГС усё больш выкарыстоўваюць краўдфандынг і іншыя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ) для атрымання індывідуальных ахвяраванняў. Многія АГС карыстаюцца міжнароднымі платформамі краўдфандынга, такімі як Indiegogo і Global Giving, але мясцовыя платформы таксама актыўна развіваюцца. У Сербіі арганізацыя падтрымкі дабрачыннасці «Catalyst Balkans» у сакавіку 2018 года запусціла мясцовую платформу краўдфандынга Donacije.rs. На працягу года 17 мясцовых, у асноўным дробных, АГС сабралі праз гэтую платформу агулам 88 400 даляраў. У Малдове ў 2018 годзе быў запушчаны сайт www.sprijina.md. У Беларусі арганізацыя «Фаланстэр» распрацавала бясплатную для выкарыстання і свабодную для ўнясення зменаў і распаўсюду праграму пад назвай «Doika», якую АГС могуць усталёўваць на свае сайты для збору ахвяраванняў і сяброўскіх унёскаў без пасярэднікаў і камісійных збораў; у 2018 годзе больш за дзесятак АГС усталявалі гэты інструмент збору сродкаў. Падчас асабліва паспяховай кампаніі краўдфандынга харвацкая арганізацыя «Common Zone Expanse of Gender and Media» сабрала больш за 30 000 даляраў ЗША для вырабу настольнай гульні «Fierce Women – All the Right Cards» з ілюстраванымі партрэтамі жанчын, якія зрабілі важны ўклад у развіццё навукі, мастацтва, культуры, фемінізму, палітыкі і правоў чалавека. Славенская арганізацыя «Humanitarcek» стварыла вэб-партал (humanitarcek-portal.firebaseapp.com), дзе патэнцыйныя донары бачаць бягучыя ініцыятывы, якія яны могуць падтрымаць; сярод іх ёсць і асабістыя пажаданні бяздомных людзей, якім дапамагае «Humanitarcek», і больш агульныя ініцыятывы, такія як калядная вячэра для бяздомных.. Ва Украіне ў 2018 годзе была запушчана платформа для ахвяраванняў праз SMS, і 8 АГС пачалі збіраць сродкі праз гэтую платформу.

### *Мэтавае прызначэнне часткі падатку*

Асобныя падаткаплацельшчыкі ў Венгрыі, Літве, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Славеніі і Эстоніі доўгі час мелі магчымасць прызначаць працэнт ад свайго падатку на прыбытак абраным АГС. У некаторых краінах сродкі, атрыманыя праз гэтыя механізмы, даволі значныя. У Польшчы збор 1% ад падаткаў за 2017 год (вынікі якога былі абвешчаны ў сярэдзіне 2018 года) быў

беспрэцэдэнтна вялікім – памер ахвяраванняў склаў 761,3 млн злотых (прыблізна 204 млн даляраў), што амаль на 100 млн злотых больш за папярэдні год. Колькасць ахвярадаўцаў павялічылася на паўмільёна, і больш за 14 мільёнаў чалавек (больш за палову ўсіх падаткаплацельшчыкаў) скарысталіся 1-працэнтным механізмам. У Венгрыі агульная сума 1-працэнтных адлічэнняў ад падатку на прыбытак вырасла ў 2018 годзе з 7,5 да 8,28 млрд форынтаў (прыблізна з 26,8 млн да 29,5 млн даляраў). Аднак колькасць падаткаплацельшчыкаў, якія карыстаюцца гэтай магчымасцю, зменшылася, хутчэй за ўсё, у выніку ўвядзення ў 2017 годзе сістэмы аўтаматычнай падатковай дэкларацыі, па якой падатковы орган рыхтуе падатковыя формы для падаткаплацельшчыкаў на падставе дадзеных, якія прадстаўляюць працадаўцы, што пазбаўляе падаткаплацельшчыкаў неабходнасці рабіць дэкларацыі самім, калі яны не хочуць правяраць іх дакладнасць або прызначаць частку падатку АГС. У 2018 годзе, ужо другі год запар, малдоўскія падаткаплацельшчыкі маглі накіраваць 2% ад падатку на прыбытак у акрэдытаваную АГС. Хаця яшчэ толькі 2,4% падаткаплацельшчыкаў скарысталіся гэтай магчымасцю, колькасць падаткаплацельшчыкаў, якія накіроўваюць працэнт падатку на прыбытак у АГС, павялічыўся на 34% у перыяд з 2017 па 2018 год, у той час як сума, сабраная АГС, павялічылася ўдвая.

### *Сацыяльнае прадпрымальніцтва*

Сацыяльныя прадпрыемствы працягваюць развівацца па ўсёй Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі. У гэтым годзе ў дакладах па краінах адзначаюцца некаторыя інавацыйныя прыклады сацыяльных прадпрыемстваў. У Албаніі арганізацыя «Partners Albania» адкрыла дэсертную краму «Ke Buono» ў Фіеры, выкарыстоўваючы канфіскаваную маёмасць мафіі. У Кіеве рэстаран «Urban Space 500» накіроўвае 80% свайго прыбытку на падтрымку праектаў па ўсім горадзе. У справаздачах па Арменіі, Беларусі, Малдове, Паўночнай Македоніі, Сербіі і Славеніі адзначаецца, што рост гэтага сектара звязаны з наяўнасцю донарскага фінансавання. Так, напрыклад, у Арменіі сацыяльныя прадпрымальнікі могуць звярнуцца за падтрымкай да USAID, ЕЗ, Impact Hub Yerevan, Фонду KASA, Чырвонага Крыжа Арменіі, Асацыяцыі сацыяльных прадпрыемстваў Арменіі і Цэнтра сацыяльных прадпрымальнікаў Фонду грамадзянскага развіцця і партнёрства.

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ФАРМАВАННІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

Агульная ўстойлівасць АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі зноў паказала розныя тэндэнцыі ў 2018 годзе. Сем краін — Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Румынія, Сербія, Славакія і Украіна — паведамілі пра агульны спад устойлівасці, а яшчэ сем краін — Азербайджан, Арменія, Беларусь, Косава, Літва, Паўночная Македонія і Славенія — адзначылі паляпшэнне ўстойлівасці ў сектары.

### Паўночная група

Краіны Паўночнай групы (краіны Балтыі і Вышаграда) па-ранейшаму маюць самы высокі агульны ўзроўнь устойлівасці АГС у Еўропе і Еўразіі. Аднак расце разрыў паміж узроўнямі ўстойлівасці ў Прыбалтыцы і краінах Вышаградскай групы. У той час як устойлівасць АГС у Латвіі, Літве і Эстоніі ўзмацнілася або засталася на ўзроўні мінулага года, устойлівасць у Венгрыі, Польшчы і Славакіі ў 2018 годзе пагоршылася. З большага такое разыходжанне можа быць звязана з розніцай у стаўленні ўрада да АГС. У той час як урады ў краінах Прыбалтыкі працягваюць прыкладаць намаганні, каб уцягнуць АГС у працэсы прыняцця рашэнняў, урады Венгрыі, Польшчы і Славакіі нападаюць на сектар, дыскрэдытуюць яго і робяць захады па звужэнні прасторы для грамадзянскай супольнасці.



Венгрыя па-ранейшаму мае самы нізкі ўзровень устойлівасці АГС сярод краін Паўночнай групы, яе агульны паказчык у 2018 годзе знізіўся, што адбываецца ўжо на працягу апошніх сямі год. Новыя абмежавальныя законы і пераслед з боку ўрада прывялі да скарачэння паказчыкаў прававых умоў і грамадскага іміджу, у той час як узмацненне палітычнай прадузятасці і адсутнасць празрыстасці дзяржаўнага фінансавання спрыялі пагаршэнню фінансавай устойлівасці. Традыцыйныя каналы адвакатавання і спробы весці перамовы з дзяржаўнымі інстытутамі застаюцца малаэфектыўнымі і становяцца ўсё большай праблемай, перашкаджаючы адвакатыўным намаганням арганізацый. Таксама паменшылася прастора АГС для аказання паслугаў.

Устойлівасць АГС у Польшчы пагаршаецца ўжо трэці год запар, паколькі палітычная палярызацыя ў краіне працягвае ўплываць на працу АГС. Арганізацыі, засяроджаныя на пытаннях, якія супярэчаць парадку дня кансерватыўнага ўрада, у тым ліку ў галіне правоў чалавека, антыдыскрымінацыі, правоў жанчын і аховы навакольнага асяроддзя, мелі абмежаваны доступ да дзяржаўнага фінансавання і па-ранейшаму прадстаўляліся ў негатыўным святле сродкамі масавай інфармацыі, якія кантралююцца ўрадам альбо маюць блізкія сувязі з кіруючай партыяй. Акрамя таго, пагоршылася якасць грамадзянскага дыялогу, і грамадскія кансультацыі рэдка выкарыстоўваліся асэнсавана.

У Славакіі забойства журналіста, які вёў свае расследаванне, і яго нявесты выклікала шырокі грамадскі шок і прывяло да хвалі масавых пратэстаў і адстаўкі прэм'ер-міністра. Нягледзячы на тое, што ацэнка адвакатавання палепшылася як адлюстраванне ролі сектара ў гэтых падзеях, агульная ўстойлівасць АГС пагоршылася, паколькі арганізацыі, якія займаліся адвакатаваннем, сталі аб'ектамі інтэнсіўнай паклёпніцкай кампаніі з абвінавачваннямі ў тым, што яны з’яўляюцца замежнымі агентамі.

Устойлівасць АГС палепшылася ў 2018 годзе ў Літве і Славеніі. У Славеніі балы па трох з сямі параметраў устойлівасці АГС — арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць і адвакатаванне – у 2018 годзе былі рэкалібраваны, каб лепш адлюстроўваць сітуацыю ў краіне і адпавядаць іншым балам у рэгіёне. Гэты перагляд быў спалучаны з паляпшэннем большасці параметраў устойлівасці, найбольшае з якіх было ў сферы прававога асяроддзя, бо пасля некалькіх гадоў абмеркавання быў прыняты новы рамачны закон. Гэтыя змены

ўпершыню перавялі агульны бал устойлівасці АГС у Славеніі ў катэгорыю «Устойлівасць высокая», а гэта азначае, што ўсе краіны рэгіёну, за выключэннем Венгрыі, маюць агульныя паказчыкі ўстойлівасці АГС на самым высокім ўзроўні.

У Літве АГС пабудавалі моцныя сувязі з мэтавымі групамі і сабралі вялікую колькасць прыхільнікаў; Саветы НДА і Нацыянальная кааліцыя НДА сістэматычна прадстаўлялі сектар, узмацняючы адвакатаванне АГС; урад краіны зноў пацвердзіў сваё абавязацельства перадаваць значную частку дзяржаўных паслугаў АГС, спрыяючы паляпшэнню гэтага параметра; давер насельніцтва да сектара значна павялічыўся.

### Краіны паўднёвай групы

У сярэднім, паказчыкі агульнай устойлівасці краін Паўднёвай групы (Паўднёва-Усходняя Еўропа) працягваюць знаходзіцца паміж краінамі Паўночнай групы і Еўразіі. Усе дзевяць краін дэманструюць агульныя паказчыкі ўстойлівасці, якія трапляюць у вузкі дыяпазон катэгорыі «Устойлівасць нестабільная» паміж баламі 3,4 (Балгарыя і Харватыя) і 4,1 (Сербія). Дзве краіны — Косава і Паўночная Македонія — зведалі паляпшэнне агульных паказчыкаў устойлівасці АГС у 2018 годзе, а тры краіны — Балгарыя, Румынія і Сербія — пагаршэнне.



*Звярніце ўвагу, што ў 2018 годзе некаторыя балы па параметрах у гэтых краінах былі рэкалібраваныя. Больш дэталяў змешчана ў краінавых справаздачах

У Косава ў 2018 годзе палепшылася пяць з сямі паказчыкаў устойлівасці АГС. Павелічэнне колькасці мясцовых арганізацый, якія даюць гранты, прывяло да прагрэсу ў фінансавай устойлівасці і інфраструктуры сектара. Празрыстасць, канкурэнцыя і якасць працэсаў размеркавання дзяржаўных сродкаў сярод АГС паляпшаецца, што спрыяе дасягненню пазітыўных зменаў у галіне аказання паслуг АГС. Некалькі грамадскіх адвакатыўных кампаній, у тым ліку адна з іх, накіраваная на зніжэнне стыгматызацыі людзей, якія сталі ахвярамі сэксуальных злачынцаў, мелі значны ўплыў. Акрамя таго, прыкметна палепшыўся давер грамадства да АГС.

У Паўночнай Македоніі новы ўрад, сфармаваны ў сярэдзіне 2017 года, прыняў пазітыўныя, але абмежаваныя меры для павышэння празрыстасці і адкрытасці дзяржаўных інстытутаў, спрыяючы паляпшэнню ўсіх параметраў устойлівасці АГС, за выключэннем арганізацыйнага патэнцыялу, які застаўся без зменаў. У 2018 годзе спыніўся інстытуцыянальны пераслед шэрагу АГС, і ў арганізацый з’явілася больш магчымасцяў удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў. Аказанне паслугаў, асабліва сацыяльных, некалькі палепшылася, і Міністэрства працы і сацыяльнай палітыкі прадэманстравала гатоўнасць павялічыць фінансаванне і супрацоўнічаць з суб'ектамі грамадзянскай супольнасці. Павелічэнне дзяржаўнага фінансавання, карпаратыўнай падтрымкі і збору сродкаў на мясцовым узроўні падмацавала фінансавую устойлівасць АГС, а інфраструктура, якая падтрымлівае сектар, стала мацней са стварэннем новых рэсурсных цэнтраў і пашырэннем супрацоўніцтва ў сектары. На заканчэнне, імідж сектара АГС крыху палепшыўся, хаця на АГС па-ранейшаму ўплывалі негатыўныя кампаніі, накіраваныя супраць сектара ў папярэднія гады.

Як і ў Венгрыі з Польшчай, устойлівасць АГС у Румыніі пагоршылася, часткова з-за крокаў, якія робіць урад, па звужэнні грамадзянскай прасторы. Прававое асяроддзе пагаршалася пры павелічэнні спробаў рэгулявання дзейнасці і фінансавання АГС. Акрамя таго, уступіла ў моц негатыўная падатковая палітыка, і дзяржаўныя чыноўнікі няславілі АГС. Супрацоўніцтва з урадам працягвае слабець, а дзяржаўныя органы пазбаўляюць грамадзян і АГС жадання ўдзельнічаць у палітычным працэсе. Высокапастаўленыя дзяржаўныя чыноўнікі і палітыкі часцей выкарыстоўвалі негатыўную рыторыку і абвінавачвалі АГС у тым, што яны з’яўляюцца замежнымі агентамі. Акрамя таго, АГС атрымалі абмежаваны доступ да традыцыйных крыніц фінансавання, павялічылася цякучасць кадраў, і за год АГС аказалі менш паслугаў.

Сербія таксама адчувае канцэнтрацыю ўлады ў руках свайго прэзідэнта, з-за чаго краіну аднеслі да катэгорыі часткова свабоднай у дакладзе «Свабода ў свеце» (Freedom in the World), апублікаваным Freedom House у пачатку 2019 года ўпершыню за некалькі гадоў. У гэтым кантэксце ў 2018 годзе пагоршылася агульная ўстойлівасць АГС, адзначаны негатыўныя зрухі ў прававым асяроддзі, адвакатаванні, аказанні паслуг, інфраструктуры сектара і грамадскім іміджы. Найбольш пацярпела адвакатаванне, бо ўрад супраціўляўся публічнаму дыялогу і ставіўся да любых староннніх прапаноў ці крытыкі палітыкі і рашэнняў урада як да нападаў на дзяржаву ці да асабістых нападаў на прэзідэнта. Акрамя таго, былі прынятыя прававыя нормы, якія перашкаджаюць працы АГС, урад — і на нацыянальным, і на мясцовым узроўні — часцей спрабаваў выцесніць АГС са сферы аказання паслугаў; а грамадскія актывісты падвяргаліся ўсё большай колькасці публічных нападаў з боку дзяржаўных і мясцовых органаў улады.

У цэлым, устойлівасць АГС таксама нязначна пагоршылася ў Балгарыі на працягу года, пры гэтым негатыўныя зрухі адзначаліся ў фінансавай устойлівасці з-за пастаяннай адсутнасці магчымасцяў фінансавання АГС і ў грамадскім іміджы з-за працяглай негатыўный кампаніі супраць АГС. Гэты негатыў быў злёгку збалансаваны паляпшэннем інфраструктуры сектара і арганізацыйнага патэнцыялу: пастаянныя напады на АГС падштурхнулі іх пачаць абмяркоўваць, як супрацьстаяць негатыўнай рыторыцы, а новыя захады і ініцыятывы, створаныя на працягу года, прыцягнулі ўвагу грамадскасці і атрымалі грамадскую падтрымку.

### Еўразія

Сярэднія паказчыкі ацэнкі ўстойлівасці ў Еўразіі па-ранейшаму ніжэйшыя за краіны Паўночнай і Паўднёвай групы. Паказчыкі ўстойлівасці АГС у Еўразіі ў 2018 годзе нязначна зраўняліся. Ва Украіне, краіне з наймацнейшай устойлівасцю ў Еўразіі, яна нязначна пагоршылася, а ў краінах з найніжэйшым узроўнем устойлівасці ў рэгіёне — Беларусі і Азербайджане — яна палепшылася. Агульная ўстойлівасць у Арменіі за год таксама палепшылася.

Украіна была адзінай краінай Еўразіі, якая адчула зніжэнне ўстойлівасці АГС у 2018 годзе; негатыўныя зрухі былі адзначаныя ў прававым асяроддзі і адвакатаванні. Закон 2017 года, які патрабуе ад актывістаў па барацьбе з карупцыяй публічна дэклараваць свае актывы, уступіў у моц, і парламент паспрабаваў увесці дадатковыя патрабаванні фінансавай справаздачнасці для

АГС, якія атрымліваюць замежнае фінансаванне. За год больш за паўсотні актывістаў пацярпелі фізічна. Намаганні АГС па адвакатванні, хоць і засталіся моцнымі, але ў 2018 годзе былі менш паспяховымі за папярэднія гады. З іншага боку, фінансавая устойлівасць палепшылася, бо АГС атрымалі пашыраны доступ да фінансавых рэсурсаў як дзяржаўнага, так і прыватнага сектара.




У Азербайджана па-ранейшаму самы нізкі ўзровень устойлівасці ў параўнанні з любой краінай гэтага выдання Індэкса, і яго АГС працягваюць працаваць у абмежавальных умовах. Аднак адносіны паміж ўрадам і АГС у 2018 годзе некалькі палепшыліся, што спрыяла паляпшэнню агульнай устойлівасці АГС, прычым станоўчыя зрухі былі адзначаныя ў прававым асяроддзі, фінансавай устойлівасці, адвакатаванні, інфраструктуры сектара і грамадскім іміджы. Пераслед АГС зменшыўся, колькасць грантаў, ахвяраванняў і замежных сервісных кантрактаў, зарэгістраваных у Міністэрстве юстыцыі, павялічылася; некаторыя дзяржаўныя структуры прадэманстравалі павышаную гатоўнасць да супрацоўніцтва з АГС, што дазволіла шырокаму колу АГС удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў; мясцовыя структуры прапанавалі больш магчымасцяў для навучання і пашырылі міжсектарныя партнёрскія адносіны паміж АГС і ўрадам. Грамадскі імідж сектара некалькі палепшыўся паралельна з больш прыязным стаўленнем урада да АГС.

Падобным чынам устойлівасць АГС у Беларусі на працягу года нязначна палепшылася, часткова з-за адлігі ў адносінах паміж урадам і грамадзянскай

супольнасцю. АГС зазналі менш варожай рыторыкі і пераследаў. Акрамя таго, парламент краіны прагаласаваў за скасаванне артыкулу Крымінальнага кодэксу, які прадугледжваў крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый. Нягледзячы на гэта, беларускія АГС працягваюць дзейнічаць ва ўмовах варожага клімату і рэгулярных парушэнняў правоў чалавека. З развіццём мясцовых крыніц фінансавання ў 2018 годзе палепшылася фінансавая ўстойлівасць грамадскіх арганізацый, а павелічэнне колькасці грамадскіх дыскусій, кансультацый і лічбавай актыўнасці палепшыла адвакатаванне. Былі ініцыяваны новыя праграмы па нарошчванні патэнцыялу, і АГС атрымалі больш шырокія магчымасці для развіцця сумесных ініцыятыў і партнёрства. Нарэшце, грамадскі імідж сектара таксама палепшыўся ў выніку пастаянных высілкаў АГС на працягу апошніх некалькіх гадоў, накіраваных на павелічэнне сваёй прысутнасці ў сродках масавай інфармацыі, выкарыстанне сацыяльныя сетак і прыцягненне да ўдзелу ў сваіх мерапрыемствах высокапастаўленых чыноўнікаў.

У адрозненне ад лёгкіх зрухаў у Азербайджане і Беларусі, 2018 год стаў пераломным у палітычнай гісторыі Арменіі. У гэтым кантэксце агульная ўстойлівасць сектара АГС палепшылася ў 2018 годзе з адзначанымі поспехамі па ўсіх паказчыках. АГС адыгралі ключавую ролю ў беспрэцэдэнтнай палітычнай трансфармацыі, якая прывяла да паляпшэння вынікаў адвакатавання і грамадскага іміджу. Дзяржаўны пераслед АГС знізіўся; значная колькасць праектаў па нарошчванні патэнцыялу, якія фінансуюцца донарамі, спрыялі паляпшэнню арганізацыйнага патэнцыялу, аказанню высакаякасных паслуг і дыверсіфікацыі фінансавых рэсурсаў. Былі распрацаваны новыя ўдасканаленыя платформы для дыялогу і супрацоўніцтва з АГС, а таксама пашыраны спектр праграм па нарошчванні патэнцыялу і магчымасцяў навучання.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Краінавыя справаздачы змяшчаюць паглыблены агляд сектараў АГС у дваццаці чатырох краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Мы спадзяемся, што гэта штогадовае даследаванне працягне фіксаваць важныя тэндэнцыі развіцця і будзе карысным для АГС, уладаў, донараў і даследчыкаў, зацікаўленых у развіцці сектара арганізацый грамадзянскай супольнасці.

# УСТОЙЛІВАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ - 2018

**Сталіца:** Мінск
**Насельніцтва:** 9,527,543
**ВУП на чалавека:** $18,900
**Індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу:** вельмі высокі (0.808)
**Свабода ў свеце:** не свабодная краіна (21/100)

## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.4 (2017: 5.5)




Палітычная сітуацыя ў Беларусі істотна не змянілася, нягледзячы на тое, што ў апошнія гады ўлады краіны гаварылі пра лібералізацыю. Устойлівасць беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці ў 2018 годзе палепшылася на 0.1. АГС зазналі менш варожай рыторыкі і менш жорсткіх рэпрэсій з боку ўлады, у тым ліку ў сувязі з працягненням паляпшэння адносін паміж чыноўнікамі і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. Акрамя таго, доўгачаканая адмена артыкула 193.1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжваў крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый, крыху палепшыла прававое асяроддзе. Нягледзячы на гэта, беларускія АГС працягваюць працаваць у неспрыяльных умовах, а правы чалавека ў краіне па-ранейшаму рэгулярна парушаюцца.

У 2018 годзе АГС сталі больш фінансава ўстойлівымі дзякуючы пашырэнню магчымасцяў для прыцягнення сродкаў з мясцовых крыніц, а сітуацыя з адвакатаваннем палепшылася ў сувязі з ростам колькасці грамадскіх абмеркаванняў, кансультацый і развіццём лічбавага актывізму. Тым не менш, абмежаваны доступ да фінансавання і слабыя магчымасці АГС уплываць на прыняцце ў краіне палітычных рашэнняў застаюцца аднымі з найбольш вострых праблемаў для беларускіх арганізацый. Інфраструктура, якая забяспечвае падтрымку АГС ў Беларусі, працавала больш эфектыўна дзякуючы з'яўленню новых праграм па ўмацаванні патэнцыялу АГС, а таксама развіццю сумесных

ініцыятыў і партнёрстваў у сектары. На працягу апошніх гадоў АГС пастаянна нарошчвалі сваю прысутнасць у медыя і сацыяльных сетках і прыцягвалі да ўдзелу ў сваіх мерапрыемствах высокапастаўленых чыноўнікаў, у выніку чаго палепшыўся грамадскі імідж сектара. Арганізацыйны патэнцыял і аказанне паслугаў АГС засталіся, у цэлым, на тым жа ўзроўні.

Хаця Беларусь у многіх сферах залежыць ад Расіі, краіна адначасова ўмацоўвае сувязі з Еўрапейскім Звязам, што вымушае яе старанна балансаваць паміж еўрапейскімі і расійскімі інтарэсамі. У 2018 годзе і беларускія ўлады, і АГС выказвалі занепакоеннасць з нагоды росту пагрозы расійскай прапаганды для нацыянальнай бяспекі. Расійскія медыя нярэдка публікавалі матэрыялы, якія дыскрэдытуюць грамадзянскую супольнасць Беларусі, а ў сацыяльных сетках з'яўляліся старонкі, якія прасоўваюць прарасійскі парадак і мімікруюць пад АГС.

Па стане на 1 ліпеня 2018 гадоў ў Беларусі было зарэгістравана 2 907 грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку 227 міжнародных, 770 рэспубліканскіх і 1 910 мясцовых, а таксама 42 062 арганізацыйныя структуры грамадскіх аб'яднанняў. Зарэгістравана таксама 28 прафесійных саюзаў, 39 саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, 207 фондаў і 7 рэспубліканскіх дзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў. У першым паўгоддзі 2018 года было зарэгістравана 66 новых грамадскіх аб'яднанняў і 22 новыя фонды. Афіцыйныя дадзеныя аб колькасці АГС, зарэгістраваных у якасці некамерцыйных установаў, адсутнічаюць. Каля 200 АГС, якія дзейнічаюць у Беларусі, з-за неспрыяльнага прававога асяроддзя былі зарэгістраваныя ў іншых краінах, уключаючы Літву і Польшчу. Паводле дадзеных даследавання «Грамадзянская супольнасць Беларусі: сучасны стан і ўмовы развіцця (2015-2017)», праведзенага ў кастрычніку 2018 года Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі і Цэнтрам прававой трансфармацыі (Lawtrend) па замове Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, колькасць АГС ў Беларусі, уключаючы арганізацыі, зарэгістраваныя ў розных арганізацыйна-прававых формах, у тым ліку ў іншых краінах, і незарэгістраваныя АГС, складае каля 3 000.

У апошнія гады змянілася структура сектара АГС Беларусі. Узрасла актыўнасць нефармальных ініцыятыў і актывістаў, у той жа час у створаных даўно, традыцыйных АГС назіраецца менш прыкметаў узмацнення або росту ўстойлівасці. Акрамя таго, у агульным ліку зарэгістраваных арганізацый павялічваецца доля некамерцыйных установаў, паколькі працэс іх рэгістрацыі больш просты.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.6 (2017: 6.8)




Прававы асяродак для дзейнасці беларускіх АГС у 2018 годзе крыху палепшыўся. У выніку шматгадовых адвакатыўных намаганняў з боку беларускіх АГС і міжнародных арганізацый у снежні 2018 года беларускі парламент прагаласаваў за выключэнне з Крымінальнага кодэкса артыкула 193.1, які прадугледжваў адказнасць за арганізацыю і ўдзел у дзейнасці незарэгістраваных арганізацый. Хаця на працягу апошніх некалькіх гадоў па гэтым артыкуле ніхто з актывістаў не быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, сілавыя структуры выкарыстоўвалі яе для запалохвання незарэгістраваных АГС. Нягледзячы на тое, што крымінальнае пакаранне адменена, забарона на дзейнасць незарэгістраваных арганізацый захавалася. Крымінальная адказнасць заменена на адміністрацыйную ў выглядзе штрафаў да $600, якія накладаюць у пазасудовым парадку органы ўнутраных справаў і юстыцыі, і ўлады могуць выкарыстоўваць гэта як інструмент далейшага ціску на незарэгістраваныя АГС.

Агулам, беларускія АГС у 2018 годзе працягнулі працаваць у неспрыяльных прававых умовах. Заканадаўства па-ранейшаму ўтрымлівае шмат калізійных нормаў, а правапрымяняльная практыка не аднастайная і з боку дзяржаўных органаў носіць даволі суб'ектыўны характар.

АГС у Беларусі зарэгістраваныя ў асноўным у адной з трох арганізацыйна-прававых формаў: як грамадскія аб'яднанні, фонды і некамерцыйныя ўстановы. Грамадскія аб'яднанні – гэта добраахвотныя аб'яднанні грамадзянаў, якія могуць рэгістравацца на мясцовым, рэспубліканскім або міжнародным узроўнях. Для стварэння мясцовага грамадскага аб'яднання патрабуецца не менш за дзесяць заснавальнікаў, для рэспубліканскага – пяцьдзесят заснавальнікаў, а для стварэння міжнароднага аб'яднання – дзесяць заснавальнікаў з Беларусі і не менш за тры грамадзяніна іншых дзяржаваў. Рэспубліканскія і міжнародныя аб'яднанні рэгіструюцца ў Міністэрстве юстыцыі, а мясцовыя аб'яднання – ва ўпраўленнях юстыцыі абласных выканаўчых

камітэтаў. Рашэнне аб рэгістрацыі прымаецца на працягу месяца з дня падачы дакументаў. Адно або некалькі фізічных і/або юрыдычных асобаў могуць стварыць фонд. Мясцовыя фонды павінны мець статутны капітал не менш за 1 200 даляраў ЗША, а рэспубліканскія і міжнародныя фонды – каля 12 000 даляраў. Фонды рэгіструюцца тымі ж органамі, што і грамадскія аб'яднанні.

Дзяржава працягвае адвольна тлумачыць патрабаванні да рэгістрацыі, што значна абмяжоўвае магчымасці для дзейнасці АГС. Поруч з магчымым крымінальным пакараннем за дзейнасць без рэгістрацыі гэтыя практыкі вымушаюць усё больш грамадскіх ініцыятыў атрымліваць рэгістрацыю за мяжой або выбіраць прававую форму некамерцыйнай установы, працэдура рэгістрацыі якой значна прасцей. У мінулыя гады АГС часта рэгістраваліся як некамерцыйныя ўстановы толькі пасля таго, як атрымлівалі адмову ў рэгістрацыі ў форме грамадскіх аб'яднанняў. Цяпер многія ініцыятывы падаюць дакументы на рэгістрацыю адразу як установы, нават не спрабуючы зарэгістравацца ў іншай форме. Установа можа быць створана адным заснавальнікам – фізічнай або юрыдычнай асобай. Паколькі яны не з'яўляюцца сяброўскімі арганізацыямі, установам не патрабуецца мець урэгуляваныя ўнутраныя калегіяльныя працэдуры кіравання і прыняцця рашэнняў, і, такім чынам, гэта не спрыяе фарміраванню ў грамадстве прынцыпаў дэмакратычнасці прыняцця рашэнняў. Акрамя таго, некамерцыйныя ўстановы пазбаўлены права ўдзельнічаць у назіраннях за выбарамі ці ўваходзіць у некаторыя грамадскія рады, а іх заснавальнікі нясуць асабістую адказнасць па абавязацельствах арганізацыі.

Нарматыўна-прававая база дазваляе дзяржорганам адмаўляць у рэгістрацыі любому грамадскаму аб'яднанню або фонду, чыё з'яўленне «нязручнае» для дзяржавы. У 2018 годзе ў рэгістрацыі было адмоўлена некальнім АГС. Напрыклад, Даследча-асветніцкаму грамадскаму аб'яднанню «Дзея», у місіі якога заяўлена пабудова грамадзянскай супольнасці, вяршэнства права і зацвярджэнне прынцыпаў свабоды, дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі.

Змены ў заканадаўства аб масавых мерапрыемствах былі прынятыя ў ліпені 2018 года і набылі моц 26 студзеня 2019 года. Яны ўводзяць элементы заяўнага прынцыпу пры правядзенні масавых мерапрыемстваў на пляцоўках, вызначаных мясцовымі органамі ўлады. Часта гэта маланаведвальныя месцы

ўдалечыні ад гарадскіх цэнтраў, у тым ліку закінутыя стадыёны і паркі. У Мінску, горадзе з насельніцтвам амаль у два мільёны чалавек, было вызначана толькі шэсць такіх месцаў. У той жа час уведзена магчымасць прыцягнення АГС дзяржаўнымі органамі да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення сходаў са штрафам да 2 450 даляраў ЗША.

У адрозненні ад хвалі арыштаў падчас масавых акцыяў пратэсту супраць так званага «дэкрэта аб дармаедах» ў 2017 годзе, абвастрэнне рэпрэсіўных дзеянняў з боку дзяржавы знізілася, і ў 2018 годзе было затрымана і прыцягнута да крымінальнай адказнасці меншая колькасць актывістаў і журналістаў. Тым не менш, праблема рэпрэсіяў у дачыненні да АГС, уключаючы крымінальныя справы і адміністрацыйныя штрафы, захавалася. Так, у жніўні лідэраў незалежнага прафсаюзу РЭП прысудзілі да хатняга арышту тэрмінам на 4 гады за ўхіленне ад выплаты падаткаў з нібыта атрыманага на дзейнасць прафсаюза замежнага фінансавання. Акрамя таго, была распачата крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара інфармацыйнага агенцтва «БелаПАН» па фактах нявыплаты ім падатку з прыбыткаў, атрыманых за мяжой. Узбуджана крымінальная справа аб незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці ў дачыненні да Грамадскага аб'яднання «Інстытут матэматыкі і кібернетыкі». Захавалася практыка раптоўнага перапынення дамовы арэнды ў дачыненні да памяшканняў, якія арандуюцца АГС. У 2018 годзе такія выпадкі адбыліся, напрыклад, з арганізатарамі фестывалю квір-культуры «DOTYK» і Саюзам палякаў Беларусі.

Праблема з доступам да фінансавання застаецца адной з найбольш вострых для беларускіх АГС. Як і раней, з'яўляецца абавязковай рэгістрацыя замежнай бязвыплатнай дапамогі ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Для рэгістрацыі атрыманых сродкаў АГС павінны мець афіцыйнае заключэнне кампетэнтнага органа аб узгадненні мэтаў выкарыстання дапамогі і (або) мэтазгоднасці яе вызвалення ад падаткаў. Дэкрэты і ўказы Прэзідэнта вызначаюць дапушчальныя мэты, на якія АГС могуць атрымліваць замежнае і ўнутранае фінансаванне ад карпаратыўных спонсараў. Пералік гэтых мэтаў не ўключае такія сферы, як правы чалавека, гендэрная роўнасць або абарона жывёлаў. АГС таксама абавязаны рэгістраваць кожны транш атрыманых у рамках аднаго праекта сродкаў, і былі выпадкі, калі праектам у стадыі рэалізацыі было

адмоўлена ў рэгістрацыі чарговага траншу. АГС вызваляюцца ад падаткаў са сродкаў замежнай дапамогі часткова і ў выбіральным парадку. Устаноўлена забарона на ажыццяўленне грамадскімі аб'яднаннямі прадпрымальніцкай дзейнасці. Грамадскія арганізацыі маюць права ўдзельнічаць у конкурсах на дзяржаўную сацыяльную замову, абвешчаных мясцовымі ўладамі.

Цэнтр прававой трансфармацыі (Lawtrend) і Асамблея НДА Беларусі прадастаўляюць АГС бясплатную прававую дапамогу. Некалькі юрыдычных фірмаў і юрыстаў прапануюць свае паслугі АГС на платнай аснове. Існуе практыка, калі адвакаты, якія абараняюць актывістаў па палітычна матываваных справах, могуць падвяргацца ціску аж да пазбаўлення ліцэнзіі.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ: 4.7 (2017: 4.7)




Узровень развіцця арганізацыйнага патэнцыялу АГС Беларусі ў 2018 годзе істотна не змяніўся.

Беларускія АГС працягвалі нарошчваць інстытуцыянальны патэнцыял у адказ на неспрыяльныя для дзейнасці грамадзянскай супольнасці вонкавыя ўмовы і дзякуючы адданасці сваіх лідэраў і актывістаў дэмакратычным каштоўнасцям. У той жа час, у сектары назіраецца трэнд, калі лідэры АГС падоўгу не змяняюцца і па меры «старэння» іх арганізацыі надаюць значна менш увагі забеспячэнню пераемнасці і развіццю ў актывістаў лідэрскіх якасцяў. У выніку больш маладыя сябры, супрацоўнікі і валанцёры АГС сутыкаюцца з тым, што расці ў арганізацыі па кар'ернай лесвіцы становіцца няма куды, ўсе ключавыя пазіцыі занятыя, і яны часта шукаюць працу ў іншых сектарах або ствараюць новыя арганізацыі, з аднаго боку, пашыраючы гэтым сектар, з другога боку, аслабляючы патэнцыял арганізацый, якія яны пакідаюць.

Такія вядучыя АГС, як Цэнтр экалагічных рашэнняў, Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны», таварыства «Зялёная сетка» і іншыя, разумеюць важнасць працы з мэтавымі групамі і прыхільнікамі. Зялёная

сетка, напрыклад, арганізуе спецыяльныя мерапрыемствы, такія як Дзень вегана, Гадзіна Зямлі і Дзень без аўтамабіля, што дапамагае ім прыцягваць новых і падтрымліваць сувязі з існуючымі прыхільнікамі. Маладзейшыя арганізацыі з роварнага, моладзевага, урбаністычнага сектараў таксама добра ўсведамляюць каштоўнасць працы з прыхільнікамі і ўзаемадзейнічаюць з імі ўсё больш актыўна. АГС, арыентаваныя на аказанне дапамогі бенефіцыярам, напрыклад сацыяльныя арганізацыі, разумеюць, што важна ацэньваць патрэбы і інтарэсы іх мэтавых груп, але часцяком яны робяць гэта не вельмі паспяхова з-за недахопу неабходных фінансавых і чалавечых рэсурсаў. У некаторых выпадках АГС лічаць, што для адаптацыі паслугаў да пераменлівых патрэбаў кліентаў і вонкавых умоваў патрабуецца шмат намаганняў, а гэта, на іх думку, не апраўдана. Новыя нефармальныя тэматычныя грамадскія рухі, такія як ініцыятыва «Маршыруй, дзетка!», пратэсты супраць будаўніцтва акумулятарнага завода ў Брэсце, кампанія «#БНР100» па святкаванні 100-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі і ініцыятыва па абароне вайсковых могілак у Мінску, атрымалі адчувальную грамадскую падтрымку, залучаючы людзей, для якіх гэтыя пытанні мелі вялікае значэнне.

Беларускія АГС добра знаёмыя з практыкай стратэгічнага планавання. У краіне ёсць эксперты, здольныя аказаць кваліфікаваную дапамогу АГС у вызначэнні арганізацыйных прыярытэтаў. Шэраг АГС, якія працуюць у экалагічнай, моладзевай і праваабарончай сферах, умеюць складаць стратэгічныя планы і кіруюцца імі ў працэсе прыняцця рашэнняў. У многіх АГС ёсць выразна сфармуляваныя місіі. Тым не менш, ёсць шмат арганізацый, якія гатовыя мяняць свае прыярытэты пад бягучыя патрабаванні донараў, каб атрымаць фінансаванне.

Нягледзячы на тое, што грантадаўцы звяртаюць увагу на важнасць рэгулярнай ацэнкі эфектаў ад дзейнасці АГС, толькі некаторыя арганізацыі маюць сістэмы вымярэння вынікаў сваёй працы. Сярод іх – Фонд «Новая Еўразія», Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам, ОДБ Брусэль.

У адпаведнасці з заканадаўствам усе зарэгістраваныя АГС за выключэннем некамерцыйных установаў павінны мець рады/праўленні, чые паўнамоцтвы і абавязкі прапісаныя ў статутах. Аднак у многіх арганізацыях падзел паўнамоцтваў кіруючага органа і іншых арганізацыйных структур не

выконваецца, і гэта нярэдка правакуе канфлікты. Супрацоўнікі АГС часта выбіраюцца ў кіруючыя органы і выконваюць адначасова і кіруючыя функцыі, і функцыі штатных работнікаў. У многіх АГС кіраўнікі і сябры праўленняў не мяняюцца гадамі. Больш дасведчаныя АГС спрабуюць укараняць працэдуры папярэджання канфлікту інтарэсаў, але звычайна яны дакументальна не фіксуюцца.

Ува многіх АГС, уключаючы Зялёную сетку, Нацыянальны моладзевы савет «РАДА», Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, Human Constanta, распрацаваны ўнутраныя палітыкі, якімі яны кіруюцца ў сваёй паўсядзённай дзейнасці. У цэлым, у большасці АГС ёсць альбо няпісаныя правілы, якіх яны прытрымліваюцца, альбо прапісаныя палітыкі, якія існуюць толькі на паперы. У 2018 годзе шэраг грамадскіх арганізацый, напрыклад Праваабарончы цэнтр «Вясна», Беларускі Хельсінскі камітэт і Саюз беларускіх пісьменнікаў, праявілі цікавасць да распрацоўкі гендэрнай палітыкі і палітыкі ў сферы правоў чалавека.

АГС па-ранейшаму ў вялікай ступені залежаць ад донарскага фінансавання, і таму супрацоўнікі АГС у асноўным працуюць у праектах за кошт грантаў па грамадзянска-прававых дамовах, а не ў сталым штаце арганізацыі. Кадравая палітыка развіта слаба: ува многіх АГС не прапісаныя службовыя інструкцыі, не ўрэгуляваныя працэдуры чарговых і дэкрэтных адпачынкаў. Цякучасць кадраў – звычайная з'ява, паколькі спецыялісты з досведам працы ў АГС здольныя знайсці сталую працу ў сферы бізнэса з вышэйшым заробкам на пазіцыях менеджэраў або даследчыкаў. АГС кампенсуюць дэфіцыт супрацоўнікаў і сродкаў, прыцягваючы знешніх спецыялістаў па бухгалтарскаму ўліку, інфармацыйных тэхналогіях і юрыдычных паслугах. У сектары працягвае назірацца высокі попыт на прафесійных фандрэйзераў, якіх па-ранейшаму не хапае.

І буйныя, і невялікія АГС усё часцей залучаюць у сваю дзейнасць валанцёраў і стажораў. Так, ProWomen.by дэлегуе стажорам частку паўнамоцтваў па сувязях з грамадскасцю, маркетынгу і арганізацыі мерапрыемстваў. У снежні 2018 года ў Мінску прайшоў міжнародны форум «На тваім баку», дзе АГС абмеркавалі праблемы і пазнаёміліся з лепшымі практыкамі працы з валанцёрамі і прыхільнікамі. Паводле Сусветнага індэкса дабрачыннасці 2018, гэтак сама як і ў папярэднім годзе, 19% апытаных беларусаў займаліся валанцёрскай дзейнасцю.

Многія АГС карыстаюцца сучасным абсталяваннем і маюць шырокі ахоп у сацыяльных сетках і ў інтэрнэце. Расце цікавасць АГС да выкарыстання ў сваёй працы ліцэнзійнага праграмнага забеспячэння. Як правіла, АГС набываюць офіснае абсталяванне за кошт сродкаў донарскіх праектаў альбо выкарыстоўваюць уласныя персанальныя кампутары, прынтэры, мабільныя тэлефоны і аўтамабілі для патрэбаў арганізацыі. Часам камерцыйныя арганізацыі перадаюць ужыванае абсталяванне АГС. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі і анлайн-інструменты, уключаючы Telegram, Trello, Slack і Facebook. У 2018 годзе Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, Baltic Internet Policy Initiative і Хар'юскі Цэнтр Прадпрымальніцтва і Развіцця (Эстонія) у рамках сумеснай ініцыятывы арганізавалі майстар-класы па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях для развіцця АГС.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.3 (2017: 6.4)




Арганізацыі грамадзянскай супольнасці сталі больш фінансава ўстойлівымі ў 2018 годзе дзякуючы паступоваму пашырэнню магчымасцяў для прыцягнення сродкаў з мясцовых крыніц. Нягледзячы на гэта, абмежаваны доступ да фінансавання застаецца адной з найбольш вострых праблем для беларускіх АГС.

АГС працягваюць залежаць ад замежнага фінансавання. Хаця аб'ёмы падтрымкі для грамадзянскай супольнасці Беларусі застаюцца прыкладна на тым жа ўзроўні, АГС адчуваюць памяншэнне доступу да грантаў з-за мяжы. Паводле дадзеных даследавання «Грамадзянская супольнасць Беларусі: актуальны стан і ўмовы развіцця», 13 з 15 падсектараў АГС лічаць праблемай скарачэнне фінансавання з боку замежных донараў. Такая сітуацыя звязана са зменамі ў структуры донарскай падтрымкі на працягу апошніх гадоў. Значная частка сродкаў перадаецца на адміністраванне і рэграньтынг міжнародным структурам, напрыклад агенцтвам ААН, і кансорцыумам АГС, усё больш сродкаў інвестуецца ў развіццё мясцовых ініцыятыўных суполак, і немалая частка фінансавання дастаецца арганізаваным дзяржавай недзяржаўным

арганізацыям (GONGO), такім як Навагрудскі дабрачынны фонд «Мы і наш горад», які быў створаны згодна з рашэннем мясцовага выканаўчага камітэта і ўзначалены яго супрацоўнікамі.

Акрамя таго, дзяржава працягвае ствараць адміністрацыйныя і прававыя бар'еры для доступу АГС як да мясцовых, так і да замежных рэсурсаў. Так, адзін з праектаў, падтрыманы Еўрапейскім Звязам, які мусіў накіраваць каля 2,5 млн еўра на рэгрантынг беларускім АГС, не змог атрымаць ад уладаў дазвол на рэалізацыю ў Беларусі на працягу ўсяго 2018 года.

На працягу 2018 года АГС надавалі больш увагі прыцягненню рэсурсаў унутры краіны, развіваючы краўдфандынг і наладжваючы больш цесныя сувязі з бізнес-супольнасцю. Моладзевае грамадскае аб'яднанне «Фаланстэр» распрацавала модуль для збору ахвяраванняў «Doika», які арганізацыі могуць усталяваць на свой сайт, каб збіраць ахвяраванні інтэрнэт-карыстальнікаў і сяброўскія ўнёскі без пасярэднікаў і высокіх камісіяў. На працягу года больш за дзесятак АГС скарысталіся гэтым інструментам фандрэйзінга.

У 2018 годзе грамадскім ініцыятывам удалося сабраць на трох краўдфандынгавых платформах каля 920 000 даляраў ЗША, амаль на 50% больш за 2017 год. Паводле дадзеных даследавання «Аналіз рынку дабрачыннасці і матываў ажыццяўлення ахвяраванняў у Беларусі», праведзенага кампаніяй «SATIO» па замове Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа ў 2018 годзе, ахвяраванні дабрачынным грамадскім арганізацыям складаюць каля 40 млн даляраў ЗША ў год. 50% гэтай сумы прыпадае на ахвяраванні грамадзянаў, сярэдняя сума ахвяраванняў – каля 8 даляраў ЗША. Па дадзеных Сусветнага індэкса дабрачыннасці 2018, лік беларусаў, якія ахвяравалі грошы на дабрачыннасць, вырасла на 1% і склала 21%.

У 2018 годзе прыватны сектар арганізаваў некалькі конкурсаў, накіраваных на падтрымку сацыяльных праектаў, грамадскіх ініцыятыў і АГС. Сярод іх конкурс брэнда «Актывія», накіраваны на падтрымку актыўнасці жанчын у сферах мастацтва, медыя, сацыяльных праектаў і ўрбаністыкі; конкурс «#Паскарэнне», прызначаны для таго, каб натхніць супольнасці на сумеснае самастойнае рашэнне важных праблем; конкурс сацыяльных стартапаў «SAP UP Беларусь».

Мясцовыя органы ўлады ў рамках дзяржаўнай сацыяльнай замовы фінансуюць паслугі АГС у сферы сацыяльнага абслугоўвання і прафілактыкі сацыяльна небяспечных захворванняў, ВІЧ. Сума, выдзеленая з дзяржаўнага бюджэту на конкурснае кантрактаванне паслугаў АГС супараўнальная з 2017 годам – 330 000 даляраў ЗША. Пераважна ж сістэма дзяржаўнай падтрымкі АГС ў Беларусі заснавана на прамым фінансаванні лаяльных да дзяржавы арганізацый, якія знаходзяцца пад яе кантролем.

Не шмат якія АГС бяруць плату за свае паслугі або прадукты. Арганізацыі, зарэгістраваныя ў форме грамадскіх аб'яднанняў, па заканадаўстве не маюць права самастойна займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. У той жа час у 2018 годзе АГС сталі часцей здаваць у арэнду памяшканні іншым АГС для правядзення мерапрыемстваў і браць нязначныя ўнёскі з удзельнікаў адукацыйных праграм, якія тым не менш не пакрываюць усе выдаткі. Працягнула развівацца сацыяльнае прадпрымальніцтва, а таксама інфраструктура для яго падтрымкі. Больш за 20 ініцыятыў прайшлі навучанне ў другой школе сацыяльнага прадпрымальніцтва Biz4all, арганізаванай ОДБ Брусэль. Большасць грамадскіх аб'яднанняў збіраюць сяброўскія ўнёскі, але для пераважнай большасці з іх гэта не з'яўляецца істотнай крыніцай даходаў.

У вельмі невялікай колькасці АГС укаранёныя надзейныя сістэмы фінансавага менеджменту. Некаторыя арганізацыі доўгі час не могуць закрыць вакансіі галоўных бухгалтараў. У сувязі з пагрозай бяспекі многія АГС баяцца быць фінансава празрыстымі і падсправаздачнымі. Некаторыя арганізацыі адмовіліся ад публікацыі фінансавых справаздачаў пасля таго, як атрымалі негатыўную зваротную сувязь ад грамадскасці на іх змест. У асноўным фінансавыя справаздачы ў адкрыты доступ выкладаюць АГС, якія разлічваюць на краўдфандынг, напрыклад, арганізатары фестывалю дакументальнага кіно аб правах чалавека «Watch Docs Belarus», каб іх спонсары і прыхільнікі маглі праверыць выкарыстанне сродкаў.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.1 (2017: 5.2)

Параметр «адвакатаванне» ў 2018 годзе некалькі палепшыўся. Павялічылася колькасць грамадскіх абмеркаванняў, арганізаваных міністэрствамі, і кансультацый дзяржаўных органаў з АГС. Узрасла і грамадзянская актыўнасць у сетцы. Аднак у большасці выпадкаў адвакатыўныя

кампаніі АГС даволі працяглыя па часе, і ў 2018 годзе яны яшчэ не прывялі да сістэмных зменаў.

Механізмы ўдзелу АГС у працэсах прыняцця палітычных рашэнняў няўстойлівыя. Калі бізнес-саюзы, сацыяльныя, урбаністычныя і экалагічныя арганізацыі ўключаны ў грамадскія рады пры міністэрствах і міжсектарныя працоўныя групы і рэгулярна даюць экспертныя кансультацыі розным дзяржаўным органам, то ўдзел праваабарончых арганізацый абмежаваны разавымі кансультацыямі. Так, з удзелам экспертаў Мінскага роварнага таварыства была распрацавана зацверджаная ў лютым 2018 года Нацыянальная канцэпцыя аб развіцці роварнага руху, якая прадугледжвае супрацоўніцтва дзяржаўнага сектара з грамадскім пры распрацоўцы рэгіянальных стратэгій. Колькасць грамадскіх абмеркаванняў, арганізаваных міністэрствамі на ўласных сайтах, павялічылася з 51 у 2017 годзе да 108 у 2018 годзе, аднак, як і ў папярэднія гады, дзяржаўныя органы не публікавалі ні справаздачы аб праведзеных абмеркаваннях, ні аналіз атрыманых прапаноў. Практыка публікацыі справаздачаў аб выкананні дзяржаўных планаў і стратэгій у Беларусі таксама вельмі рэдкая і патрабуе ад АГС мэтанакіраваных адвакатыўных высілкаў. У 2018 годзе праваабарончым арганізацыям атрымалася дамагчыся публікацыі Міністэрствам замежных спраў справаздачы аб выкананні Нацыянальнага плана па правах чалавека за 2017 г.




У 2018 годзе быў прыняты новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах», які ўступіў у моц у лютым 2019 года. Закон змяшчае палажэнні аб абавязковым публічным абмеркаванні некаторых законапраектаў і пастаноў, вызначае мінімальныя тэрміны для публічных абмеркаванняў і патрабуе публікацыі вынікаў абмеркаванняў.

Расце папулярнасць інтэрнэт-платформаў для стварэння і адпраўкі петыцый. У 2018 годзе колькасць петыцый, створаных на платформе Petitions.by, вырасла на 26%. Сацыялагічныя апытанні паказваюць, што 21% беларусаў лічыць анлайн-петыцыі эфектыўнай формай удзелу ў працэсах

прыняцця рашэнняў, але 18% перабольшваюць фактычны ўплыў петыцый на заканадаўчыя ініцыятывы. Дзяржаўны інтэрнэт-партал 115.бел, які дапамагае грамадзянам вырашаць гарадскія праблемы, у 2018 годзе распаўсюдзіў сваю працу на рэгіёны, даючы рэгіянальным актывістам дадатковыя магчымасці для адвакатавання. У горадзе Бяроза, напрыклад, за некалькі месяцаў 2018 года з дапамогай гэтага сэрвісу было вырашана трынаццаць муніцыпальных праблемаў, звязаных з добраўпарадкаваннем тэрыторыі, камунальным абслугоўваннем, дрэннымі дарогамі, прыбіраннем вуліц і гарадскім асвятленнем.

Шэраг адвакатыўных кампаній, пачатых АГС у папярэднія гады, атрымалі паспяховае завяршэнне ў 2018 годзе. У лістападзе ў выніку адвакатыўных дзеянняў Цэнтра экалагічных рашэнняў, Грамадскага аб'яднання «Экадом», установы «Агра-Эка-Культура» і іншых АГС быў прыняты закон «Аб арганічнай сельскай гаспадарцы». Урбаністычная ініцыятыва «Smart Homel» паспяхова адвакатавала на карысць публікацыі генеральнага плана Гомеля. Шырокая кампанія, якая аб'яднала мноства людзей і арганізацый з усіх сектараў грамадства, пераканала ўлады ўпершыню за шмат гадоў афіцыйна дазволіць шырокае святкаванне 100-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі, тады як папярэднія гадавіны праходзілі без дазволу ўладаў і не так масава. Бізнес-асацыяцыям удалося прасунуць значную частку сваіх прапановаў па змяненні Падатковага кодэкса і дамагчыся адмены так званага «ўказа аб ілжэпрадпрымальніцтве».

Пратэстныя кампаніі па экалагічных і сацыяльна-культурных пытаннях змаглі мабілізаваць шмат прыхільнікаў, аднак у 2018 годзе не дасягнулі чаканых вынікаў. Знамянальна, што дэманстрацыі супраць будаўніцтва акумулятарнага завода ў Брэсце сабралі каля 2 000 чалавек. Рух «Маці 328» актыўна выступаў за скарачэнне турэмных тэрмінаў за незаконны абарот наркотыкаў, але парламент не ўключыў гэтую папраўку ў прыняты варыянт Крымінальнага кодэкса.

Адсутнасць узгодненай пазіцыі АГС негатыўна ўплывала на працэс прыняцця рашэнняў. Так, законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі» быў адкліканы Саветам міністраў з Палаты прадстаўнікоў у тым ліку і па прычыне супярэчнасцяў у пазіцыях зоаабарончых арганізацый па шэрагу пытанняў.

У беларускіх адвакатыўных кампаніях часта недаацэньваецца важнасць публічных камунікацый з усімі зацікаўленымі бакамі. У выпадку з прасоўваннем

канцэпцыі закона «Аб супрацьдзеянні хатняму гвалту» арганізатары кампаніі не змаглі ўзгадніць свае пазіцыі з тымі, хто выступаў супраць законапраекта. У выніку, пад уплывам рэлігійных і неліберальных папулісцкіх арганізацый, прэзідэнт негатыўна выказаўся з нагоды законапраекта, і праца над ім была спынена. Спыненне працы над законапраектам дало штуршок фармаванню ініцыятывы «Маршыруй, дзетка!», якая набрала больш за 2 000 паслядоўнікаў у сацыяльных сетках у першыя дні свайго існавання.

У 2018 годзе Асамблея НДА, Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі, Цэнтр прававой трансфармацыі (Lawtrend) і іншыя арганізацыі праводзілі даследаванні і публікавалі рэкамендацыі па паляпшэнні прававых умоваў для дзейнасці АГС. У выніку працяглых адвакатыўных намаганняў беларускіх АГС у 2018 годзе парламент прагаласаваў за выключэнне з Крымінальнага кодэкса артыкула 193.1, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.0 (2017: 5.0)




Якасць і асартымент паслугаў беларускіх АГС і ахоп імі мэтавых груп у 2018 годзе істотна не змяніліся. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці аказваюць разнастайныя паслугі ў сацыяльнай, дабрачыннай, адукацыйнай, экалагічнай, праваабарончай і іншых сферах. У той жа час АГС, якія займаюцца пытаннямі кіравання воднымі і энергетычнымі рэсурсамі, беспрацоўя, дэменцыі, алкагольнай залежнасці, па-ранейшаму недастаткова.

Адны АГС, часам для выканання патрабаванняў донараў, праводзяць ацэнку патрэбаў і залучаюць мэтавыя групы ў планаванне сваёй дзейнасці. Іншыя арганізацыі кіруюцца ўласным разуменнем таго, што патрэбна іх кліентам. Вельмі нешматлікія АГС збіраюць дадзеныя, каб прадэманстраваць свой уклад у вырашэнне мясцовых праблем і задавальненне патрэбаў. Тым не менш, у 2018 годзе Цэнтр сацыяльных і эканамічных даследаванняў «CASE Belarus» і Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне «АКТ» ацанілі

сацыяльныя і эканамічныя эфекты паслугаў АГС па працаўладкаванні з суправаджэннем маладых людзей з інваліднасцю, прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва і працаўладкаванні асобаў, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі. Згодна з вынікамі ацэнкі, за шэсць гадоў рэалізацыі праграмы працаўладкавання з суправаджэннем БелАПДІіМІ яе меркаваная сацыяльна-эканамічная выгада склала больш за 1 млн даляраў ЗША.

АГС прапануюць паслугі не толькі сваім сябрам і прыхільнікам, але і шырокаму колу іншых мэтавых груп. Так, праваабарончая арганізацыя «Human Constanta» праводзіць юрыдычныя кансультацыі для замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, а Асацыяцыя «Адукацыя для будучыні» арганізуе мерапрыемствы і трэнінгі ў галіне STEM-адукацыі для педагогаў школ. Шэраг АГС аказваюць паслугі па развіцці арганізацыйнага патэнцыялу, прапануюць публікацыі, даследаванні і экспертную аналітыку іншым АГС і прыватным асобам. З боку дзяржаўных установаў і міжнародных інстытуцый расце попыт на экспертызу АГС ў галіне гарадскога, сацыяльнага і эканамічнага развіцця, а таксама на навучанне аказанню дапамогі неабароненым групам.

Каб пашырыць ахоп і лепш адпавядаць патрэбам кліентаў, у 2018 годзе АГС часцей аказвалі паслугі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, такіх як чат-боты, анлайн-інструменты і мабільныя дадаткі. Ініцыятыва «Журналісты за талерантнасць» запусціла J4T-Checker – анлайн-сэрвіс для праверкі тэксту на некарэктную лексіку і маркеры мовы варожасці; інтэрнэт-платформа «Zmena» прапануе інтэрактыўныя заняткі і карысныя матэрыялы для актывістаў мясцовых супольнасцяў; у Грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» з'явіўся дыстанцыйны курс па асновах назірання за птушкамі і мабільны дадатак «Определитель птиц Беларуси».

АГС усё часцей імкнуцца прадастаўляць паслугі і прадукты без дыскрымінацыі па той ці іншай прыкмеце, але мала хто свядома практыкуе недыскрымінацыйны падыход у сваёй працы. Вынікі даследавання «Даступнасць публічных прастораў і мерапрыемстваў у г. Мінску: ацэнка стану і перспектывы зменаў», праведзенага Жывой Бібліятэкай, паказваюць, што арганізатары публічных мерапрыемстваў і прастораў, як правіла, усведамляюць патрэбы людзей, якія выкарыстоўваюць вазкі, і яны дасведчаныя аб экалагічна прыязных каштоўнасцях, але недастаткова разумеюць патрэбы іншых груп –

людзей з парушэннямі зроку, прадстаўнікоў старэйшага пакалення, бацькоў з маленькімі дзецьмі, ЛГБТК +.

У асноўным паслугі АГС фінансуюцца замежнымі донарамі і аказваюцца бенефіцыярам бясплатна. У 2018 годзе некалькі павялічылася колькасць АГС, якія бяруць плату за ўдзел у сваіх мерапрыемствах і адукацыйных курсах, але, як правіла, гэтыя ўзносы не пакрываюць выдаткі АГС на прадастаўленне гэтых паслугаў. Прэс-клуб Беларусь у 2018 годзе зарабіў на камерцыйнай дзейнасці больш за 125 000 даляраў ЗША, аднак такі выпадак – хутчэй выключэнне, чым правіла.

Мясцовыя ўлады і некаторыя міністэрствы ўсё часцей прызнаюць уклад грамадзянскай супольнасці ў аказанне паслугаў, асабліва ў сферы падтрымкі людзей з інваліднасцю. Тым не менш, гэта прызнанне часцяком не выяўляецца публічна і пакуль не прывяло да фарміравання ўстойлівай сістэмы фінансавання паслугаў АГС з боку дзяржавы. У 2018 годзе мясцовыя органы ўлады праз механізм дзяржаўнага сацыяльнага заказу пачалі прадастаўляць грамадскім арганізацыям субсідыі на аказанне паслугаў па прафілактыцы ВІЧ.

## ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА: 5.0 (2017: 5.1)




У 2018 годзе інфраструктура, якая падтрымлівае сектар арганізацый грамадзянскай супольнасці, працавала больш эфектыўна. Фонд «Новая Еўразія» запусціў доўгатэрміновую праграму «Лідэры перамен», якая накіравана на ўмацаванне прафесійнага патэнцыялу АГС і развіццё супрацоўніцтва паміж суб'ектамі грамадзянскай супольнасці. У АГС з'явілася больш магчымасцяў для правядзення мерапрыемстваў, свабодных ад цэнзуры, і развіцця сумесных ініцыятыў і партнёрстваў. Аднак і аб'ём падтрымкі, і асартымент паслугаў, даступных арганізацыям грамадзянскай супольнасці, і агульная ўстойлівасць інфраструктуры сектара па-ранейшаму значна залежаць ад донарскага фінансавання.

Шэраг арганізацый, як у сталіцы, так і ў абласных цэнтрах краіны, аказваюць АГС і актывістам кансультацыйныя, адукацыйныя і інфармацыйныя паслугі. Сярод іх Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, ОДБ Брусэль, Фонд «Новая Еўразія», Цэнтр «Трэці сектар», Агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч», Vitebsk4me. Падтрымку АГС прадастаўляюць таксама парасонавыя арганізацыі і галіновыя асацыяцыі – Асамблея НДА, Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы, Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА». У 2018 годзе ў Мінску адкрылася новая пляцоўка «Тэрыторыя правоў», дзе праваабарончыя і іншыя дэмакратычныя АГС могуць бясплатна праводзіць сустрэчы, трэнінгі, дыскусіі і іншыя мерапрыемствы.

У Віцебску, Гомелі і Гродне працягнулі працу рэгіянальныя рэсурсныя цэнтры па развіцці дадатковай адукацыі дарослых, створаныя ў рамках праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць», які рэалізуецца Прадстаўніцтвам зарэгістраванага аб'яднання «Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.» у Беларусі ў супрацоўніцтве з Асацыяцыяй дадатковай адукацыі і асветы і Народным універсітэтам г. Кам пры падтрымцы Еўрапейскага Звяза і DVV International. Пасярэдніцкія арганізацыі падтрымкі ўсё часцей праводзяць кансультацыі з АГС перад запускам новых праграм, аднак складана сказаць, наколькі аб'ектыўна ацэньваюцца і ў якой ступені задавальняюцца патрэбы розных тыпаў АГС. Шэраг арганізацый, напрыклад Беларускі дом правоў чалавека, Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне», Беларускі дзіцячы хоспіс, ажыццяўляюць рэгрантынг сродкаў міжнародных донараў сярод мясцовых арганізацый грамадзянскай супольнасці.

У некаторых выпадках з-за цяжкасцяў з рэгістрацыяй такіх праектаў АГС не размяркоўваюць грашовыя сродкі, а закупаюць ад свайго імя і перадаюць субгранцёрам матэрыялы для рэалізацыі іх праектаў. Напрыклад, Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый у межах конкурса «Добры сусед» набываў і перадаваў матэрыялы, неабходныя пераможцам конкурса для рэалізацыі мясцовых ініцыятыў. Беларускія бізнесмены і кампаніі працягваюць падтрымліваць сацыяльныя праекты праз конкурс «Social Weekend», колькасць заявак на ўдзел у якім пастаянна расце.

АГС усведамляюць важнасць сумеснай дзейнасці, абменьваюцца інфармацыяй унутры падсектароў, сетак і кааліцый, узгадняюць свае мэты і парадкі, аднак іх намаганні нярэдка падрываюцца канкурэнцыяй за фінансавыя

рэсурсы донараў. Арганізацыі ствараюць кааліцыі, у асноўным для правядзення акцый, мерапрыемстваў і адвакатавання. У лістападзе 2018 года АГС, якія працуюць з людзьмі сталага ўзросту, сфармавалі кааліцыю «За годнае даўгалецце»; кааліцыя праваабарончых арганізацыяў падрыхтавала сумесны альтэрнатыўны даклад у Камітэт ААН па правах чалавека. Частка сектара прасоўвае свае інтарэсы праз Нацыянальную платформу грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства і Асамблею НДА Беларусі.

У краіне працуюць кваліфікаваныя трэнеры, кансультанты і эксперты па асноўных напрамках дзейнасці АГС. У прадстаўнікоў АГС ёсць магчымасці для навучання базаваму ўзроўню па тэмах менеджменту праектаў, фандрэйзінга, сувязяў з грамадскасцю, развіцця мясцовых супольнасцяў і ініцыятыў, сацыяльнага прадпрымальніцтва і іншых напрамках. Фонд «Новая Еўразія» ў супрацоўніцтве з Інстытутам бізнесу Беларускага дзяржаўнага універсітэта запусціў паглыблены адукацыйны курс «Менеджмент НКА». У той жа час эксперты адзначаюць недахоп навучання больш прасунутаму ўзроўню для дасведчаных кіраўнікоў і супрацоўнікаў АГС.

Хоць у цэлым культура партнёрства і дыялогу як унутры сектара АГС, так і з іншымі сектарамі, пакуль не сфармавалася, у 2018 годзе павялічыўся ўзровень супрацоўніцтва АГС з бізнесам і медыя. Платформа «Імёны» і Альфа-Банк пачалі сумесны праект, у ходзе якога кліенты банка могуць накіроўваць кэшбэк ад выдаткаванай імі сумы на падтрымку праектаў платформы. Форум па кіраванні інтэрнэтам, які прайшоў у 2018 годзе ў трэці раз, праводзіцца ў партнёрстве грамадскіх і камерцыйных арганізацый, дзяржаўных структур і медыя. На рэгулярных Крэатонах (хакатонах для крэатараў) прафесіяналы рэкламнай індустрыі распрацоўваюць ідэі для АГС і сацыяльных ініцыятыў. Паводле дадзеных даследавання кампаніі «SATIO» і Беларускага Чырвонага Крыжа «Аналіз рынку дабрачыннасці і матываў ажыццяўлення ахвяраванняў у Беларусі», 49% бізнес-арганізацый, якія займаюцца дабрачыннасцю, аказваюць бязвыплатную дапамогу дабрачынным АГС.

Як і раней, у 2018 годзе высокапастаўленыя чыноўнікі наведвалі мерапрыемствы грамадзянскай супольнасці, мясцовыя ўлады і АГС рэалізоўвалі сумесныя праекты, аднак узаемадзеянне АГС і дзяржавы пакуль складана назваць партнёрствам.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.4 (2017: 5.5)




У 2018 годзе грамадзкі імідж АГС палепшыўся. На працягу апошніх 3-4 гадоў беларускія АГС праводзяць сістэматычную працу па прасоўванні свайго іміджу, павялічваючы аб'ём тэматычнага кантэнту ў медыя, інтэнсіўна выкарыстоўваючы сацыяльныя сеткі і прымаючы на сваіх мерапрыемствах чыноўнікаў высокага рангу.

У 2018 годзе і дзяржаўныя, і незалежныя медыя асвятлялі сектар АГС пераважна пазітыўна. Найбольшай увагай карысталіся тэмы і падзеі сацыяльна-эканамічнай накіраванасці, такія як мясцовы грамадскі актывізм, праблемы людзей з інваліднасцю, экалагічныя акцыі, эканамічныя форумы. Адзін з праектаў Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам атрымаў у СМІ больш за 500 згадак, а ўдзельнікі конкурсу сацыяльных праектаў «Social Weekend» сталі героямі рэпартажаў на вядучых тэлеканалах краіны. Пры гэтым дзейнасць АГС сферы адвакатавання асвятлялася ў СМІ значна менш. Шэраг медыя, уключаючы 34mag.net, CityDog.by, Kyky.org, Бинокль, а таксама найбуйнейшыя парталы TUT.by і Onliner.by працягнулі рэгулярна пісаць пра ініцыятывы АГС і знаёміць аўдыторыю з іх актывістамі.

Узровень дасведчанасці аб дзейнасці АГС застаецца невысокім: згодна з нацыянальным апытаннем, праведзеным у 2018 годзе па замове Pact, толькі 26% беларусаў ведаюць пра дзейнасць АГС у краіне і 18% давяраюць АГС (тыя ж лічбы былі ў 2017 годзе); 3% беларусаў удзельнічалі ў дзейнасці АГС і 9% – у грамадска карыснай дзейнасці, арганізаванай грамадзянамі. Падчас анлайн-апытання Baltic Internet Policy Initiative 40% жыхароў Мінска не змаглі назваць ніводнай гарадской грамадскай ініцыятывы. Аналіз рынку дабрачыннасці, праведзены па ініцыятыве Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК), паказаў, што з 400 дабрачынных арганізацый, якія дзейнічаюць у краіне, беларусы ведаюць менш за 5%. Паводле даследавання дапамогі людзям у цяжкіх жыццёвых сітуацыях, праведзенага Міжнародным агенцтвам сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў (MASMI) для Праграмы падтрымкі

Беларусі Федэральнага ўрада Германіі, рэспандэнты давяраюць АГС больш за дзяржаўныя арганізацыі. Падчас нацыянальнага апытання Беларускай аналітычнай майстэрні (BAW) грамадзянская супольнасць была названая другім пасля дзяржавы магчымым ініцыятарам перамен у Беларусі.

Стаўленне да АГС уладаў рэспубліканскага і мясцовага ўзроўню ў 2018 годзе палепшылася. Даследаванні, праведзеныя Даследчым цэнтрам дзяржаўнага кіравання SYMPA і Інстытутам «Палітычная сфера», паказалі, што ў апошнія гады ўзаемадзеянне грамадзянскай супольнасці і мясцовых уладаў стала больш цесным і канструктыўным. Аднак многія афіцыйныя асобы ўспрымаюць АГС як працоўную сілу для вырашэння мясцовых праблем або як інструмент для прыцягнення замежных сродкаў, а не ў якасці экспертаў, якія могуць дапамагчы ў распрацоўцы рэгіянальных праграм. Праўда, па-ранейшаму, назіраецца разрыў у разуменні канцэпцыі грамадзянскай супольнасці прадстаўнікамі АГС і ўладамі. Прэзідэнт пад «грамадзянскай супольнасцю» разумее аб'яднанні, створаныя і кіруемыя дзяржавай. Міністр унутраных справаў, у сваю чаргу, публічна выказаў дыскрымінацыйныя каментары ў дачыненні да ЛГБТ-актывістаў, і пры гэтым пракуратура не знайшла падставаў для прыцягнення яго да адказнасці.

Бізнэс-сектар успрымае АГС усё больш пазітыўна. Эксперты са сферы бізнесу на грамадскіх пачатках выступалі спікерамі на мерапрыемствах АГС і арганізоўвалі ўласныя, дзе кансультавалі АГС у розных сферах. Бізнес таксама супрацоўнічае з АГС, рэалізуючы сумесныя праекты. Так, напрыклад, камунікацыйная кампанія «Velcom» і культурніцкая ініцыятыва «Кінаконг» у праекце «Беларускія ўікэнды» перакладаюць папулярныя фільмы на беларускую мову і паказваюць іх у кінатэатрах.

Сацыяльныя сеткі застаюцца найбольш эфектыўным каналам камунікацый для АГС. У 2018 годзе Цэнтр новых ідэй склаў рэйтынг грамадскіх ініцыятыў, якія маюць больш за 10 тысяч падпісчыкаў у сацыяльных сетках. У параўнанні з 2017 годам, рэйтынг вырас з 15 да 18 арганізацый; самай папулярнай арганізацыяй працягвае заставацца пошукавы атрад «Анёл» з 158 тысячамі падпісчыкаў.

АГС выкарыстоўваюць свае мерапрыемствы як пляцоўку для камунікацый з прадстаўнікамі ўлады, міжнароднымі экспертамі і дыпламатычнымі коламі. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўпершыню прыняў удзел у форуме «Усходняя

Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх», арганізаваным няўрадавай экспертнай ініцыятывай «Мінскі дыялог», а чыноўнікі высокага рангу наведалі Кастрычніцкі эканамічны форум і іншыя мерапрыемствы, арганізаваныя SYMPA, Ліберальным клубам і іншымі АГС.

Гадавыя справаздачы публікуюць толькі вядучыя арганізацыі, але ўсё больш розных АГС дзеляцца інфармацыяй аб сваіх дасягненнях у форме інфаграфікі, праз электронныя рассылкі і пасты ў сацыяльных сетках. Аднак справаздачы аб фінансах не публікуюць нават тыя АГС, якія працуюць у краіне цалкам празрыста. Некаторыя АГС прытрымліваюцца прынцыпаў самарэгулявання. У канцы 2018 года шэраг незалежных медыя прыняў стратэгію на 2019-2024 гады, якая змяшчае, у тым ліку, каштоўнасныя арыенціры сектара. Агульны этычны кодэкс АГС па-ранейшаму не прыняты, і спробаў яго распрацоўкі не назіралася.

Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (CSOSI) з’яўляецца ключавым інструментам вымярэння прагрэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі. Індэкс адсочвае прагрэс грамадскага сектара ў 24 краінах рэгіёна цягам апошніх 22 год.

Індэкс вывучае агулам варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, з фокусам на прававы асяродак для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнае развіццё, фінансавую ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктуру і грамадскі імідж. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.

Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб’яднанне “АКТ”: *actngo.info@gmail.com*.

Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці - 2018 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная на сайце Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці і FHI360.

U.S. Agency for International Development

1300 Pennsylvania Avenue,
NW Washington, DC 20523

Tel: (202) 712-0000

Fax: (202) 216-3524

**www.usaid.gov**